85.03(4Бел)
П69

Д33

Беларускі універсітэт культуры

УДК 7:37 + 37:036] (476)

Пракапцова Вера Паўлаўна

# МАСТАЦКАЯ АДУКАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ: САЦЫЯКУЛЬТУРНЫ АСПЕКТ

17.00.09 – тэорыя мастацтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**АЎТАРЭФЕРАТ**
**дысертацыі на суісканне вучонай ступені**
**доктара мастацтвазнаўства**

Мінск 2000

Работа выканана на кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры Беларускага універсітэта культуры

Навуковы кансультант – доктар мастацтвазнаўства, вядучы навуковы супрацоўнік ІМЭФ НАН Беларусі
**Нячай В.Ф.**

Афіцыйныя апаненты – доктар філасофскіх навук, прафесар, акадэмік НАН РБ
**Бабосаў Я.М.**

доктар мастацтвазнаўства, прафесар
**Смольскі Р.Б.**

доктар мастацтвазнаўства
**Шматаў В.Ф.**

Апаніруючая арганізацыя – Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі

Абарона адбудзецца "_21_" снежня_2000 г. а _10_ гадзіне на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 у Беларускім універсітэце культуры па адрасе: 220001, г.Мінск, вул. Рабкораўская, 17, ауд.231, тэлефон вучонага сакратара 222-83-36

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага універсітэта культуры.

Аўтарэферат разасланы "___"___________2000 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
доктар мастацтвазнаўства З.Я.Мажэйка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі**

Працэс фарміравання цэласнай сістэмы мастацкай адукацыі ў Беларусі дагэтуль застаецца не вывучаным. Прычын таму шмат. Адна з іх – уваходжанне беларускіх зямель на працягу гісторыі ў склад розных дзяржаў: Полацкага і Тураўскага княстваў (X–XIII стст.), Вялікага княства Літоўскага (XIII–XYIII стст.), Рэчы Паспалітай (1569 – 1772-1793-1795 гг.), Расійскай імперыі (1792–1917), Беларускай Народнай Рэспублікі (1917–1918), Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (1.1.1919–1922), БССР у складзе СССР (1922–1991), Рэспублікі Беларусь (з 1991 г.). Гэтая акалічнасць абумовіла захаванне дакументальных крыніц у розных краінах, што ўскладняе працэс іх вывучэння. Стварэнне рэтраспектывы мастацкай адукацыі на першых яе этапах ускладняюць і пэўныя хрысціянскія каноны старажытнага мастацтва, згодна якім сам твор заставаўся ананімным. Гэтыя абставіны не заўсёды дазваляюць даследчыку выявіць узаемаадносіны пэўнага майстра і яго паслядоўнікаў-вучняў.

Тым не менш, навуковая актуальнасць вывучэння мастацкай адукацыі ў сацыякультурным аспекце абумоўлена цеснай сувяззю мастацкай культуры і мастацкай адукацыі ў Беларусі. Узаемазалежнасць сінтэзу мастацтваў і фарміравання відаў мастацкай адукацыі абумоўлівае абгрунтаванне гіпотэзы плённасці разгляду спецыфікі мастацкай адукацыі ў адзінстве навучальных працэсаў у межах розных відаў традыцыйных мастацтваў. Ад вытокаў і амаль да XIX ст. развіццё прафесійнага мастацтва (і адпаведна мастацкай адукацыі) залежала ад дзейнасці пэўных сацыякультурных цэнтраў. Віды мастацтва (музыка, тэатр, выяўленчае мастацтва) існавалі ў розныя эпохі ў пэўных сацыякультурных умовах. Прызначэнне як мастацтва, так і мастацкай адукацыі ў эпоху Сярэднявечча (Y–XV стст.) вызначалася хрысціянскім светаўспрыманнем і адпаведна дзейнасцю хрысціянскіх храмаў. У эпоху Адраджэння (у Еўропе – XIY–першая палова XYII стст., на Беларусі – XYI–пачатак XYII стст.) мастацкая культура і мастацкая адукацыя развівалася ў межах рэлігійных брацтваў пэўных канфесій. У эпоху Асветніцтва (у Еўропе – XYII–пачатак XIX стст., на Беларусі – другая палова XYIII–пачатак XIX стст.,) мастацтва і адукацыя падпарадкоўваліся дыктату магнатаў прыватнаўласніцкіх гарадоў, а таксама рэалізаваліся ў межах культуры дзяржаўных гарадоў.

Такім чынам, цэласнае вывучэнне мастацкай адукацыі як гісторыка-тэарэтычнай праблемы дае магчымасць упершыню больш поўна, шматбакова раскрыць асаблівасці развіцця мастацкай культуры ў Беларусі на працягу тысячагоддзя, вызначыць ролю мастацкай адукацыі ў гэтым працэсе і ацаніць плённасць вопыту мінулых эпох для развіцця сучаснай сістэмы мастацкай адукацыі ў Беларусі.

БІБЛІЯТЭКА
...ускага універсітэта культуры
...в. N С/IV

Канцэпцыя навуковага вывучэння мастацкай адукацыі як цэласнай спецыфічнай самастойнай сістэмы і адначасова як падсістэмы агульнай метасістэмы мастацкай культуры Беларусі прапануецца ўпершыню. Комплексны, сістэмны падыход спалучаецца з гісторыка-параўнальным разгледжаннем мастацкай адукацыі ў адзінстве працэсаў, што адбываліся ў межах розных відаў традыцыйнага мастацтва. Гэта абумовіла неабходнасць аналізу вялікага масіву крыніц па гісторыка-тэарэтычных праблемах развіцця мастацкай культуры. Палажэнні філасофіі мастацтва, эстэтыкі, культуралогіі, мастацтвазнаўства служылі арыентуючай асновай прынцыпова новага комплекснага падыходу да аналізу мастацкай адукацыі і вызначэння гісторыка-тэарэтычных заканамернасцей яе фарміравання як самастойнай цэласнай сістэмы.

Дастаткова поўна і разнастайна ў працах філосафаў, сацыёлагаў, культуролагаў, псіхолагаў, мастацтвазнаўцаў даследаваны праблемы прадметнасці і функцыянальнага прызначэння мастацтва, сутнасці спосабаў мастацкага пазнання свету, сістэмнага падыходу да аналізу праблем. Найбольшай змястоўнасцю і грунтоўнасцю вызначаюцца працы А.Анікста, Б.Асафьева, Я.Бабосава, М.Бахціна, І.Блаўберга, Г.Вайткунаса, Б.Віппера, Э.Дарашэвіча, М.Кагана, У.Конана, М.Крукоўскага, Т.Ліванавай, Д.Ліхачова, А.Лосева, Ю.Лотмана, А.Мальдзіса, М.Маркава, К.Платонава, В.Розанава, А.Сарабьянава, А.Тойнбі, Н.Успенскага, А.Хогарта, В.Шастакова, О.Шпенглера, Э.Юдзіна, Л.Юлдашава і інш.

Даследаванне беларускай мастацкай культуры, гісторыі асноўных відаў мастацтва – выяўленчага, музычнага, тэатральнага, харэаграфіі, кіно – і шляхоў іх фарміравання ў Беларусі мае дастаткова грунтоўны характар. Сярод аўтараў, якія звярталіся да гісторыі выяўленчага мастацтва і архітэктуры, шырока вядомыя даследаванні А.Воінава, Н.Высоцкай, Л.Дробава, Т.Габрусь, П.Карнача, М.Кацара, А.Кулагіна, Л.Лапцэвіч, В.Шматава, В.Церашчатавай, Ю.Чантурыя; у музыказнаўстве вядомыя працы А.Ахвердавай, В.Дадзіёмавай, А.Капілава, Г.Куляшовай, Т.Ліхач, З.Мажэйкі, І.Назінай, А.Смагіна, Н.Юўчанкі; гісторыя харэаграфічнага мастацтва даследуецца Ю.Чурко; пытанні гісторыі тэатральнай культуры Беларусі разгледжаны ў працах Г.Барышава, Т.Гаробчанка, М.Каладзінскага, А.Лабовіча, Ю.Пашкіна, У.Няфёда, А.Сабалеўскага, Р.Смольскага, Ю.Сохара; тэарэтычныя асновы кінамастацтва закладзены ў даследаваннях А.Красінскага, В.Нячай, Г.Ратнікава і інш.

Багаты факталагічны матэрыял змешчаны ў рэспубліканскіх міжведамасных зборніках "Вопросы культуры и искусства Белоруссии". Асобна вылучаюцца шматтомныя манументальныя выданні: Гісторыя беларускага мастацтва: У 6 т. (Мн., 1987–1994); Гісторыя беларускага тэатра: У 3 т. (Мн., 1983–1987); Музычны тэатр Беларусі: У 4 т. (Мн., 1990–1997).



У вялікім масіве мастацтвазнаўчай літаратуры пытанні спецыяльнай мастацкай адукацыі разглядаюцца вельмі абмежавана: у кантэксце агульных праблем гісторыі і тэорыі выяўленчага, музычнага ці тэатральнага мастацтва ў Беларусі, ў біяграфічным аспекце таго ці іншага творцы. Асобна гісторыя мастацкай адукацыі асвятлялася толькі ў межах двух відаў мастацтва – музычнага (манаграфія В.П.Масленікавай "Музычная адукацыя ў Беларусі") і тэатральнага (раздзелы "Тэатральная адукацыя" у 2-м і 3-м тамах Гісторыі беларускага тэатра).

Вышэйназваныя даследаванні падрыхтавалі глебу для распрацоўкі агульных пытанняў развіцця мастацкай адукацыі ў Беларусі. Тым не менш, канцэптуальна праблема функцыяніравання мастацкай адукацыі як цэласнай спецыфічнай сістэмы ў сацыякультурным аспекце разглядаецца ўпершыню.

Гісторыка-тэарэтычнае выяўленне працэсу фарміравання мастацкай адукацыі ў Беларусі базіруецца на чатырох тэарэтычных прынцыпах: 1) аналіз асноўных мастацкіх з'яў пэўных эпох у разнастайнасці іх праяўленняў і іх уздзеяння на працэс развіцця мастацкай адукацыі; 2) вывучэнне агульнай структуры галоўных элементаў і формаў сістэмы мастацкай адукацыі, якія развіваюцца ў сацыякультурнай прасторы азначаных гістарычных эпох; 3) вызначэнне і фіксацыя асноўных, дамінантных структур мастацкай адукацыі ў пэўную сацыякультурную эпоху; 4) сістэматызацыя і параўнальны аналіз аднатыповых формаў мастацкай адукацыі, што паўтараюцца і вар'іруюцца на працягу розных гістарычных перыядаў.

Назапашванне ў гісторыка-тэарэтычнай думцы Беларусі параўнальна-гістарычных дадзеных, вялікай колькасці канкрэтных фактаў дало нам падставы для больш цэласнага, сістэмнага падыходу да вывучэння мастацкай культуры і мастацкай адукацыі. Значныя поспехі музыказнаўства, тэатразнаўства, мастацтвазнаўства (у галіне выяўленчага мастацтва), кіназнаўства на шляху навукова-тэарэтычнага асэнсавання фактаў, з'яў абумовілі магчымасць і неабходнасць гісторыка-тэарэтычнага вызначэння спецыфічных якасцей мастацкай адукацыі як цэласнага працэсу ў культуры. Прынцыпова важным з'яўляецца асэнсаванне сутнасці мастацкай адукацыі пры даследаванні яе як працэсуальнага фарміравання сістэмы сацыякультурных з'яў.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі**

Даследаванне з'яўляецца індывідуальна-аўтарскім і фарміруе самастойную галіну ў беларускім мастацтвазнаўстве. Матэрыялы дысертацыі ўваходзяць у комплексную навуковую тэму кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры Беларускага універсітэта культуры "Гісторыя мастацкай культуры Беларусі: ад вытокаў да сучаснасці", навуковым кіраўніком якой з'яўляецца дысертант

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ
Бібліятэка Беларускага універсітэта культуры
Інв. N

(зацверджана на пасяджэнні Вучонай Рады Беларускага універсітэта культуры 19 сакавіка 1996 г. Пратакол № 7).

**Мэта і задачы даследавання**

Асноўнай мэтай дысертацыі з'яўляецца выяўленне сутнасных, асноватворных заканамернасцей фарміравання мастацкай адукацыі ў Беларусі як цэласнай сістэмы і вызначэнне спецыфічных асаблівасцей яе састаўных, відавых і фармастваральных элементаў структуры на розных гістарычных этапах.

Азначаная мэта абумовіла шэраг задач:

– вызначэнне месца і ролі мастацкай адукацыі ў мастацкай культуры Беларусі ад яе вытокаў (XI–XII стст.) да перыяду станаўлення (XX ст.).
– вывучэнне асаблівасцей генезісу і эвалюцыі мастацкай адукацыі ад вытокаў да станаўлення сістэмы і далейшага яе развіцця і ўдасканалення;
– вызначэнне і характарыстыка этапаў эвалюцыі мастацкаадукацыйнай сістэмы ў Беларусі за тысячагадовы перыяд;
– навуковы аналіз прынцыпаў уздзеяння мастацкіх стыляў пэўнай сацыякультурнай эпохі на развіццё форм мастацкай адукацыі;
– выяўленне тыповых арганізацыйных формаў навучальных устаноў розных эпох з пункту гледжання іх функцыяніравання ў канкрэтнай сацыякультурнай прасторы;
– аналіз дзейнасці асобных навучальных устаноў і вызначэнне тыповых характарыстык іх арганізацыйнай структуры і мастацкага зместу навучання;
– характарыстыка спецыфічных асаблівасцей сістэмы мастацкай адукацыі ў сувязі з рознымі відамі мастацтва і выяўленне агульных заканамернасцей іх фарміравання ва ўзаемадзеянні і ўзаемаабумоўленасці.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

Аб'ект даследавання – цэласная сістэма мастацкай адукацыі ў Беларусі, што развівалася на працягу стагоддзяў у межах пэўных сацыякультурных прастораў і сфарміравалася ў стабільную дзяржаўную структуру толькі ў XX ст.

Прадмет даследавання – мастацкая адукацыя як галіна мастацкай культуры Беларусі, гісторыка-тэарэтычная праблема эвалюцыі яе ўзроўняў, відаў, формаў, навучальных прынцыпаў і метадаў.

**Гіпотэза**

Канцэпцыя навуковага комплекснага вывучэння развіцця мастацкай адукацыі ў Беларусі як цэласнай сістэмы на працягу XI–XX стст. ў адзінстве навучальных працэсаў у межах розных відаў традыцыйных мастацтваў, якая прапануецца ў даследаванні, дае падставы для вызначэння значнасці ролі мастацкай адукацыі ў развіцці багатай і своеасаблівай мастацкай культуры Беларусі.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання**

У дысертацыі выкарыстаны агульнанавуковы сістэмны падыход – сістэма прынцыпаў, метадаў, спосабаў навуковага пазнання, які дае падставы для вызначэння агульнай накіраванасці рэтраспектыўнага, актуальнага і перспектыўнага развіцця мастацкай адукацыі. Тэарэтыка-метадалагічнай асновай сталі асноўныя навуковыя палажэнні мастацтвазнаўства, філасофіі, эстэтыкі, культуралогіі.

Структурна-функцыянальны і гісторыка-тыпалагічны падыход дазволіў вызначыць структуру і функцыі мастацкай адукацыі як з'явы ў культурным працэсе, выявіць найбольш агульныя заканамернасці генезісу, фарміравання і эвалюцыі мастацкай адукацыі як з пункту гледжання арганізацыі розных відаў і формаў навучальных устаноў, так і з пункту гледжання развіцця прынцыпаў і метадаў навучання. Усё гэта дазволіла прааналізаваць працэсы ўзаемадзеяння асобных элементаў, узроўняў і форм мастацкай адукацыі ў парадку фарміравання і ўскладнення сістэмы мастацкай адукацыі. Пры гэтым на кожным этапе яе развіцця выяўляліся якасна новыя ўласцівасці яе структуры.

Прынцып сістэмна-структурнага аналізу разумеўся і выкарыстоўваўся аўтарам як ў статычным плане, які дае часава-прасторавы "зрэз", так і ў дынамічных планах: эвалюцыйным і рэтраспектыўным.

Сістэма мастацкай адукацыі ў Беларусі даследуецца намі ў кантэксце функцыяніравання агульнай сістэмы мастацкай культуры ва ўзаемасувязях сацыяльных, мастацкіх, асобасна-індывідуальных умоў яе развіцця.

Атрыманню навуковых вынікаў садзейнічалі метады: сістэмнага аналізу, сінтэзу, параўнання, фармалізацыі, абагульнення і сістэматызацыі фактaлагічных дадзеных, пабудовы навуковых тэорый, гіпотэз і канцэпцый.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў**

Дысертацыя з'яўляецца першым спецыяльным комплексным даследаваннем сістэмы мастацкай адукацыі, шляхі фарміравання якой ахопліваюць ў Беларусі тысячагадовы перыяд.

Упершыню аўтарам прапанавана канцэпцыя навуковага вывучэння сістэмы мастацкай адукацыі ў сацыякультурным аспекце і ў адзінстве працэсаў, што адбываліся ў межах розных відаў мастацтва.

У рабоце прапанавана пэўная логіка аналізу фарміравання сістэмы мастацкай адукацыі ў Беларусі ў XI–XX стст.: ад сінкрэтычных вытокаў набыцця мастацкіх навыкаў у эпоху Сярэднявечча (агульнапрынятыя храналагічныя межы – Y–XY стст.) – праз агульныя прынцыпы гуманістычнай скіраванасці мастацкай адукацыі ў эпоху Адраджэння (на Беларусі – XYI–пачатак XYII), размежаванне культавых і свецкіх асноў і зараджэнне самастойных відавых мастацкаадукацыйных устаноў у эпоху Асветніцтва (на Беларусі XYIII–пачатак XIX стст.), вызначэнне

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

мастацкай адукацыі як самастойнай галіны культуры ў XIX ст. – да станаўлення сістэмы дзяржаўнай мастацкай адукацыі ў XX ст. Такім чынам вызначаюцца, з аднаго боку, часавыя рамкі перыяду станаўлення мастацкай адукацыі ў Беларусі – ад вытокаў (XI–XII стст.) да перыяду фарміравання мастацкаадукацыйнай сістэмы (XX ст.), а з другога, – фармулюецца і раскрываецца сутнасна-мастацкі змест кожнага з сацыякультурных этапаў.

Упершыню прапануецца разгледжанне функцый мастацкай адукацыі як самастойнай цэласнай сістэмы (падрыхтоўка творчай індывідуальнасці ва ўмовах канкрэтных гістарычных рэалій), так і як часткі больш буйной сістэмы – поліфункцыянальнай мастацкай культуры.

**Практычная (эканамічная, сацыяльная) значнасць атрыманых вынікаў**

Матэрыялы дысертацыі выкарыстоўваліся (на працягу апошніх пяці гадоў) пры чытанні аўтарскага спецкурса "Мастацкая адукацыя ў Беларусі" для студэнтаў Беларускага ўніверсітэта культуры.

Матэрыялы дысертацыі пакладзены ў аснову манаграфій "Музычная адукацыя ў Беларусі" [Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 112 с.], "Мастацкая адукацыя ў Беларусі" [Мінск: Беларускі універсітэт культуры, 1999. – 210 с.], кампакт-дыска "Мастацкая адукацыя ў Беларусі" [Выпуск мультымедыйнай серыі "Культура Беларусі. Лепшыя старонкі" – тэхнічная распрацоўка аўтарскага калектыва "Артмультымедыа". – Мінск: Беларускі інстытут праблем культуры, Copyright, 2000]. Вынікі даследавання выкарыстоўваліся пры распрацоўцы вучэбных планаў і дзяржаўных стандартаў вышэйшай адукацыі ў галіне культуры і мастацтва [Адукацыйны стандарт. Вышэйшая адукацыя. Спецыяльнасць П.02.14.00 – Сусветная і айчынная мастацкая культура. – Мінск: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 1999; Адукацыйны стандарт. Вышэйшая адукацыя. Спецыяльнасць Г.01.01.00 – Культуралогія. – Мінск: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 1999], пры прагнастычных распрацоўках па перспектывах развіцця спецыялізацыі "выкладчык сусветнай і айчыннай мастацкай культуры", пры састаўленні і публікацыі вучэбных праграм [Мн., Беларускі універсітэт культуры, 1985–1996 гг., "Гісторыя беларускай мастацкай культуры: ад вытокаў да сучаснасці". – Мн., БелІПК, 1996.] і праграмы для здачы кандыдацкага мінімума па спецыяльнасці "Тэорыя мастацтва" [Мн., Беларускі універсітэт культуры, 1999.].

Навуковыя палажэнні і вывады, метадалагічныя прынцыпы даследавання могуць стаць асновай для далейшых навуковых пошукаў у галіне мастацкай культуры Беларусі, а таксама для развіцця новай галіны мастацтвазнаўства – вывучэння мастацкай адукацыі ў кантэксце іншых мастацкіх культур.



Сутнасны змест дысертацыі, яе фактычная аснова могуць выкарыстоўвацца пры чытанні разнастайных тэарэтычных і гістарычных курсаў у ВНУ гуманітарнага профілю: гісторыя і тэорыя мастацкай культуры, мастацкая адукацыя, мастацкая педагогіка, гісторыя розных відаў мастацтва.

Выданне манаграфій, навуковых артыкулаў, матэрыялаў навуковых канферэнцый па тэме дысертацыі абумоўліваюць эканамічную (камерцыйную) значнасць даследавання.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону**

1. Мастацкая адукацыя ў Беларусі з'яўляецца цэласнай мастацкай сістэмай, якая склалася на працягу тысячагоддзя (XI–XX стст.) і з'яўляецца важнай галіной мастацкай культуры Беларусі.

2. Структурна-функцыянальныя асаблівасці спецыфічнай сістэмы мастацкай адукацыі Беларусі адлюстроўваюць структурна-функцыянальныя асаблівасці фарміравання агульнай мастацкай культуры народа на розных этапах гістарычнага развіцця.

3. Сутнасныя якасці мастацкай адукацыі вызначаюцца сацыяльнымі ўмовамі, асаблівасцямі развіцця мастацтваў (мастацкай культуры) і арганізацыйнымі і прафесійна-метадычнымі прынцыпамі той ці іншай мастацкай школы.

4. Разгледжанне мастацкай адукацыі як сістэмы навучальных працэсаў у межах розных традыцыйных відаў мастацтва – музычнага, тэатральнага, выяўленчага – дае магчымасць больш цэласнага аналізу эвалюцыі агульнай мастацкай культуры ў Беларусі.

5. Сутнасны змест мастацкай адукацыі на розных гістарычных этапах ў Беларусі адпавядае асаблівасцям фарміравання мастацкіх стыляў у адпаведнасці са светаўспрыманнем розных сацыякультурных эпох: хрысціянская царкоўная культура і суаднесеная з ёй мастацкая адукацыя ў эпоху Сярэднявечча (на Беларусі бярэцца перыяд XI–XY стст.); рэнесансная канцэпцыя выхавання інтэлектуальнага чалавека ва ўмовах культавых устаноў розных канфесій ў эпоху Адраджэння (на Беларусі – XYI–XYII стст.); ураўнаважанае развіццё культавага і свецкага накірункаў мастацкай культуры і адукацыі ў эпоху Асветніцтва (на Беларусі – XYIII–пачатак XIX стст.); фарміраванне прафесіі вольнага мастака, музыканта, акцёра і мастацкай адукацыі як самастойнай галіны культуры ў эпоху рамантызму (XIX–пачатак XX ст.); аб'ядналае адзінай ідэяй развіццё розных відаў мастацтва і фарміраванне цэласнай сістэмы дзяржаўнай мастацкай адукацыі ў савецкай і постсавецкай культуры XX ст.

6. Даследаванне мастацкай адукацыі як працэсуальнага фарміравання сістэмы з'яў прыводзіць да высноў аб адзінстве працэсаў трансляцыі творчай спадчыны і мастацкіх навацый у галіне мастацкай культуры Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Вызначэнне логікі развіцця сістэмы мастацкай адукацыі ў Беларусі за тысячагадовы перыяд – ад вытокаў (XI–XII стст.) да перыяду станаўлення (XX ст.) – паказвае ўзаемаўплыў мастацкай культуры і мастацкай адукацыі як фактараў развіцця і ўзбагачэння мастацкіх здабыткаў у духоўнай культуры Беларусі.

8. Разгледжанне функцыянальнага прызначэння мастацкай адукацыі як унутрысістэмнага (падрыхтоўка творчай індывідуальнасці) і знешнесістэмнага – агульнасацыяльнага (адзін з аспектаў поліфункцыянальнай мастацкай культуры) дае магчымасць суаднесці значэнне творчасці таленавітых педагогаў і вучняў з развіццём мастацкіх школ, стыляў і напрамкаў у мастацкай культуры Беларусі.

9. Вызначана паняцце – Мастацкая адукацыя.

10. Адлюстраванне ў сістэме мастацкай адукацыі сацыякультурных прынцыпаў і эстэтычных накірункаў пэўнай эпохі ў іх найбольш агульных (агульнаеўрапейскія тэндэнцыі), асаблівых (у межах Беларусі) і спецыфічных (у межах вызначанай мастацкай школы) праяўленнях.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Даследаванне з'яўляецца індывідуальна-аўтарскім і фарміруе новую самастойную галіну – мастацкая адукацыя – ў беларускім мастацтвазнаўстве.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Прадстаўленная работа з'яўляецца вынікам шматгадовай даследчай працы аўтара дысертацыі па пытаннях развіцця мастацкай адукацыі ў Беларусі. Вынікі вывучэння названай праблемы апрабіраваліся падчас абароны дысертацыі на суісканне навуковай ступені кандыдата мастацтвазнаўства ("Роль музыкального образования в развитии и становлении музыкальной культуры Белоруссии". Кіеў, 1978 г.), а таксама на шматлікіх канферэнцыях, семінарах, чытаннях, дыскусіях. Папярэднюю навуковую экспертызу дысертацыя прайшла на кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры Беларускага універсітэта культуры.

**Апублікаванасць вынікаў**

Змест дысертацыі поўнасцю адлюстраваны ў публікацыях: дзве манаграфіі – "Музычная адукацыя ў Беларусі" (Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 112 с.), "Мастацкая адукацыя ў Беларусі" (Мінск: Беларускі універсітэт культуры, 1999. – 210 с.); кампакт-дыск "Мастацкая адукацыя ў Беларусі" (Выпуск мультымедыйнай серыі "Культура Беларусі. Лепшыя старонкі" – тэхнічная распрацоўка аўтарскага калектыва "Артмультымедыа". – Мінск: Беларускі інстытут праблем культуры, Copyright, 2000.); два артыкулы ў навуковых зборніках; больш за трыццаць артыкулаў у Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі, Энцыклапедычным даведніку "Беларусь", энцыклапедычных выданнях "Памяць"; сем артыкулаў ў рэцэнзуемых часопісах; сем – у матэрыялах міжнародных канферэнцый і кангрэсу.



**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, асноўнай часткі, якая ўключае пяць глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і літаратуры і дадаткаў. Поўны аб'ём дысертацыі складае 290 старонак, з іх 71 старонку займае дадатак. Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры ўключае 349 найменняў на рускай, беларускай, польскай, англійскай мовах і займае 22 старонкі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Асноўны змест дысертацыі прадстаўлены ва ўводзінах, агульнай характарыстыцы работы, пяці главах, чатырнаццаці параграфах і заключэнні. У дысертацыі таксама маюцца восем дадаткаў–схем і ілюстраваная гісторыя мастацкай адукацыі ў Беларусі.

Ва **уводзінах** даецца абгрунтаванне тэмы, вызначаюцца праблемы тэорыі і гісторыі мастацкай адукацыі, асэнсоўваюцца асноўныя відавыя (у адпаведнасці з відамі традыцыйнага мастацтва – музычнага, тэатральнага, выяўленчага) элементы цэласнай самастойнай сістэмы мастацкай адукацыі, якая фарміравалася ў Беларусі на працягу тысячагоддзя ў сацыякультурным асяроддзі пэўных гістарычных эпох.

**У агульнай характарыстыцы работы** абгрунтоўваецца актуальнасць тэмы даследавання, раскрываецца ступень яе тэарэтычнай распрацаванасці, вызначаюцца мэта і задачы, аб'ект і прадмет даследавання, метадалогія і метады, навуковая навізна і практычная значнасць атрыманых вынікаў. Фармулююцца гіпотэза і асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону. Паказаны асабісты ўклад суіскальніка, апрабацыя вынікаў дысертацыі, ступень апублікаванасці вынікаў, структура і аб'ём дысертацыі.

**У першай главе "Тэарэтыка-метадалагічныя прынцыпы функцыяніравання сістэмы мастацкай адукацыі"** ўпершыню зроблена спроба тэарэтычнага асэнсавання мастацкай адукацыі як цэласнай сістэмы ва ўзаемадзеянні яе сацыякультурнага аспекту, структурна-функцыянальных асаблівасцей і дынамікі развіцця. *У першым параграфе* (1.1. "Мастацкая адукацыя: сутнасць, функцыі і структура") даецца вызначэнне сутнасці мастацкай адукацыі, якая раскрываецца праз сэнс і сродкі развіцця асобы мастака ў пэўных сацыякультурных умовах, праз разуменне мэтазгоднасці і дасканаласці метадаў фарміравання творчай індывідуальнасці, падрыхтоўка якой з'яўляецца галоўнай мэтай мастацкай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асэнсоўваецца адпаведнасць кожнага з этапаў развіцця сістэмы мастацкай адукацыі мастацкім крытэрыям пэўнай сацыякультурнай эпохі. Сутнасць мастацкай адукацыі складаецца з набыцця і пашырэння мастацкіх навыкаў, уменняў, увогуле пазнання сусвету сродкамі мастацтва, з назапашвання мастацкіх каштоўнасцей, што ўзбагачаюць творчую індывідуальнасць, і раскрываюцца, праяўляюцца ў варыятыўнай разнастайнасці форм і метадаў мастацкіх школ, узроўняў навучальных устаноў, якія функцыяніруюць у пэўнай сацыякультурнай прасторы.

Падчас разгляду гісторыка-тэарэтычнага працэсу фарміравання мастацкай адукацыі ў Беларусі і вызначэння паняцця "мастацкая школа" да ўвагі прымаліся храналагічныя межы стылявых, творчых прынцыпаў і гістарычная дакладнасць існавання пэўных навучальных устаноў.

У першым параграфе вызначаецца паняцце "мастацкая адукацыя" як працэсуальная форма перадачы педагогамі і набыцця вучнямі сукупнасці ведаў, навыкаў, метадаў, творчых прынцыпаў, вопыту мастацкага светаўспрымання, што садзейнічае працэсу развіцця асобы, яе падрыхтоўкі да самастойнай творчай дзейнасці мастака, музыканта, дзеяча тэатра ў адзінстве суб'ектыўных і аб'ектыўных момантаў.

Важнай у здзяйсненні працэсу развіцця мастацкай адукацыі з'яўляецца цэласная сукупнасць адукацыйных працэсаў, якія ішлі ў межах розных відаў мастацтва і вызначаліся адзіным функцыянальным прызначэннем навучання, дамінантным ва ўмовах пэўнай эпохі сацыякультурным асэнсаваннем адукацыі і адпаведнымі арганізацыйна-навучальнымі цэнтрамі. Функцыянальнае прызначэнне навучання ў эпоху Сярэднявечча абумоўлівалася сутнасцю рэлігійнага выхавання, якое канцэнтравалася ў хрысціянскім храме. У эпоху Адраджэння рэалізавалася рэнесансная канцэпцыя выхавання інтэлектуальнага чалавека, здзяйснялася арганізацыя навучальных устаноў новага тыпу, ішоў працэс размежавання культавай і свецкай адукацыі. Эпоха Асветніцтва сцвердзіла новы прынцып функцыяніравання навучальных устаноў, які грунтаваўся на свецкай культуры. Мастацкая адукацыя ў эпоху рамантызму вызначылася як самастойная галіна культуры. У культуры XX ст. сфарміравалася цэласная функцыянальна мэтанакіраваная дзяржаўная сістэма мастацкай адукацыі.

Мастацкая адукацыя развіваецца як неадрыўная частка, адна з галін поліфункцыянальнай мастацкай культуры. Структура мастацкай адукацыі вызначаецца дзеяннем відавых элементаў структуры, што суадносіцца з асноўнымі відамі традыцыйных мастацтваў – музыка, выяўленчае, тэатр. Кожны з відавых элементаў убірае ў сябе ўзроўневую структуру, якая вызначае пачатковую, сярэднюю спецыяльную і вышэйшую мастацкую адукацыю. Відавыя элементы структуры мастацкаадукацыйнай сістэмы развіваліся несінхронна. У кожную эпоху на першае месца выходзілі



розныя віды мастацтва і адпаведна мастацкай адукацыі. Адзін з іх выконваў ролю структурнай дамінанты ў мастацкаадукацыйнай сістэме.

Такім чынам, адзіная сістэма мастацкай адукацыі, сукупнасць яе відавых элементаў, якія аб'яднаны агульнай структурай, узроўневая паралельнасць пашыраюць магчымасці адукацыі ў кожным відзе мастацтва. Плён і значнасць іх узаемаўзбагачэння вызначаюцца ўдасканаленнем метадычных і арганізацыйных формаў, узаемаабменам агульнымі мастацкімі дасягненнямі.

*У другім параграфе* (1.2. "Мастацкая адукацыя як сацыякультурны працэс") разглядаецца сістэма мастацкай адукацыі ў адлюстраванні сацыякультурных прынцыпаў і эстэтычных накірункаў пэўнай эпохі ў іх найбольш агульных (агульнаеўрапейскія тэндэнцыі), асаблівых (у межах Беларусі) і спецыфічных (у межах вызначанай мастацкай школы) праяўленнях. Менавіта ўзаемаўплывовасць і ўзаемазалежнасць агульных, асаблівых і спецыфічных кампанентаў вызначаюць станаўленне сістэмы мастацкай адукацыі, як сацыякультурнага працэсу і стымулююць яе развіццё.

Супастаўленне агульнаеўрапейскіх і нацыянальных (беларускіх) традыцый развіцця мастацкай адукацыі выяўляе пэўную "паралельнасць" працякання прэцэсаў арганізацыі мастацкай адукацыі ў Беларусі і ў іншых заходнееўрапейскіх краінах і вызначае "адпаведныя" ці "запозненыя" стадыі станаўлення мастацкай адукацыі.

Агульныя тэндэнцыі развіцця мастацкай адукацыі ў Беларусі на працягу ўсяго перыяда фарміравання сістэмы мастацкай адукацыі (XI-XII - XX стст.) адпавядалі агульнаеўрапейскім. Так, значэнне сістэмы "сямі вольных навук" ці "сямі вольных мастацтваў", якая была своеасаблівым арганізуючым базісам мастацкай адукацыі доўгія стагоддзі (з часоў Антычнасці да эпохі Асветніцтва) было ідэнтычна асновапалагаючым як для краін Заходняй Еўропы, так і для Беларусі. Але арганізацыйныя формы (навучальныя ўстановы), у межах якіх раскрываўся, ажыццяўляўся прынцып "сямі вольных мастацтваў", былі розныя і залежалі ад сацыякультурных умоў дзяржавы, якая існавала ў той ці іншы гістарычны перыяд на тэрыторыі Беларусі.

Развіццё сацыякультурнага працэса дазваляе назіраць паступовую і паслядоўную крышталізацыю мастацкай адукацыі як самастойнай галіны прафесійнай дзейнасці. Узаемаадносіны творцы-педагога і творцы-вучня трывала ўзыходзяць (пачынаючы з XYIII ст.) на ўзровень, дзе агульнае мастацкае выхаванне перарастае ў спецыяльную прафесійную адукацыю, што вядзе да фарміравання і ўдасканалення сістэмы мастацкай адукацыі.

Пачынаючы з XIX ст. мастацкая адукацыя набывае адносную самастойнасць і становіцца асобнай галіной культуры. Але яе дыферэнцыяцыя ва ўлонні мастацкай культуры не выводзіць мастацкую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адукацыю за межы мастацкай культуры цалкам. Мастацкая адукацыя існуе адносна самастойна ў агульным сацыякультурным рэчышчы.

Фарміраванне цэласнай сістэмы дзяржаўнай мастацкай адукацыі стабілізавалася ў сярэдзіне XX ст., калі былі адкрыты нацыянальныя мастацкія вышэйшыя навучальныя ўстановы – Беларуская дзяржаўная кансерваторыя (1932 г., з 1992 г. – Беларуская акадэмія музыкі), Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (1945 г., з 1991 г. – Беларуская акадэмія мастацтваў), Мінскі інстытут культуры (1975 г., з 1993 г. – Беларускі універсітэт культуры).

На кожным этапе развіцця сістэма мастацкай адукацыі дапаўнялася новымі кампанентамі формы. У межах пачатковага ўзроўню мела некалькі разнавіднасцей: хатняе навучанне, студыі, курсы, школы. Сярэдняя спецыяльная адукацыя – вузкапрофільныя вучылішчы (як, напрыклад, вучылішча арганістаў у Мінску ў XIX ст.), тэхнікумы, вучылішчы па відах мастацтва, каледжы. Вышэйшая адукацыя – інстытуты, кансерваторыі, акадэміі, універсітэты. Дзейнасць усіх узроўняў мастацкай адукацыі, развіццё іх формаў і іх разнавіднасцей як частак адзінай цэласнай шматузроўневай сістэмы ўзаемаабумоўлена і ўзаемна падпарадкавана: кожная з іх вызначае характар, асаблівасці і адукацыйны ўзровень іншых.

У кожнай з гістарычных эпох ёсць агульныя прыкметы, якія пры выяўленні, апісванні, вывучэнні і параўнанні даюць: а) – карціну фарміравання геаграфічнай прасторы своеасаблівай нацыянальнай (беларускай) сістэмы мастацкай адукацыі, якая на кожным гістарычным этапе спалучала прыкметы міжнацыянальнага (агульнаеўрапейскага) развіцця і ўласныя спецыфічныя асаблівасці; б) – карціну паслядоўнага станаўлення ў гістарычным часе структурных састаўляючых сістэмы мастацкай адукацыі. Разам такое часава-прасторавае развіццё сістэмы мастацкай адукацыі і вызначае своеасаблівы змест і мастацкую напоўненасць сацыякультурнага працэса.

Уся гісторыя развіцця мастацкай адукацыі як і мастацкай культуры звязана з такой з'явай як мецэнацтва, якое праяўлялася праз мэтанакіраваную дзейнасць духоўных, свецкіх асоб і дзяржавы. Фундатарамі ўстаноў культуры на Беларусі былі Прападобная ігуменння, прылічаная да ліку святых Ефрасіння Полацкая (XII ст.) – ініцыятар адкрыцця школ і вучылішчаў, заказчык вырабу напрастольнага шасціканцовага крыжа для царквы святога Спаса. Стараста Лідскі, ваявода Мінскі і Смаленскі Ян Абрамовіч (Абрагамовіч) – XVI ст., заснаваў кальвінісцкі сабор, бальніцу і школу і Варнянах (Гродзенская вобл.); Канстанцін Астрожскі (XVI ст.), пад апекай якога ўзнікла Астрожская акадэмія. Вялікую ролю ў развіцці мецэнацтва ў розных сферах культуры адыгралі старажытныя беларускія роды магнатаў – Радзівілаў, Агінскіх, Сапегаў, Тышкевічаў, а таксама дзейнасць А.Тызенгаўза, С.Зорыча, І.Храптовіча, А.Чартарыйскага і інш. Галоўным мецэнатам у сферы мастацкай адукацыі заўсёды была дзяржава, якая цалкам забяспечыла функцыяніраванне мастацкай адукацыі ў XX ст.



XX стагоддзе стала стагоддзем тэхнічнага прагрэсу. На яго аснове сфарміраваліся новыя мастацтвы – тэхнагенныя: кіно, радыё, тэлебачанне, гуказапіс, камп'ютэрныя рэаліі, якія вызначылі новыя сродкі рэпрадуцыравання і распаўсюджвання мастацкіх твораў. Сучасныя тэхнагенныя мастацтвы і тэхнагенныя метады далейшага развіцця традыцыйных мастацтваў складаюць сёння значную частку агульнай сістэмы функцыяніравання ўсіх відаў мастацтва і мастацкай адукацыі.

**У другой главе "Дзейнасць асветнікаў і вытокі мастацкай адукацыі ў Беларусі ў XI – першай палове XVII ст."** выяўляюцца вытокі і першапачатковыя арганізацыйныя формы мастацкай адукацыі. *У першым параграфе* (2.1."Агульнаеўрапейскія тэндэнцыі развіцця мастацкай культуры і адукацыі ў Сярэднія вякі") аналізуецца мастацкая культура і адукацыя ў храналагічных межах V–да сярэдзіны XVII ст., раскрываюцца асноўныя прынцыпы светаўспрымання ў эпохі Сярэднявечча і Адраджэння. Сярэднявечча (V–XV стст.) стала першай эпохай у гісторыі Еўропы, калі мастацкая культура развівалася ў рэчышчы адзінага рэлігійнага светаўспрымання – хрысціянства. Цэнтрамі культуры з'яўляліся Саборы, пры кожным з якіх меліся царкоўныя школы – адзіныя цэнтры навучання, якія рыхтавалі пісьменных людзей і для царквы, і для дзяржавы. Кола вывучаемых навук заставалася нязменным з часоў Антычнасці: "семь вольных мастацтваў".

У эпоху Сярэднявечча ў еўрапейскіх гарадах з'яўляецца асноўны элемент аб'яднання еўрапейскай культуры – вышэйшая навучальная ўстанова універсітэт (у 1215 г. быў адкрыты першы ў Заходняй Еўропе Парыжскі універсітэт). Вядучым стылем у мастацтве эпохі Сярэднявечча з'яўлялася готыка – першы ў гісторыі агульнаеўрапейскі, інтэрнацыянальны мастацкі стыль. У Беларусі рысы гатычнага стылю праявіліся ўжо ў XIII ст. (Камянецкая Белая вежа (1271–1289), а таксама ў перыяд позняй готыкі (XIY–XYI стст., Навагрудская Барысаглебская царква, Мірскі замак і інш.). Да праяўленняў готыкі ў Беларусі можна таксама аднесці стварэнне кніжнай мініяцюры, выраб мастацкіх прадметаў побыту (срэбныя лыжачкі, ключы, званочкі, эмалевыя дэкаратыўныя ўпрыгожванні і г.д.) і хрысціянскай сімволікі і эмблематыкі (мініяцюрныя распяцці, абразкі) – што было характэрна для стылю эпохі готыкі, гатычнага стылю.

Пераломнай эпохай у развіцці сусветнага мастацтва ў Сярэднія вякі стала эпоха Адраджэння (у Італіі – XIY–XYI стст., у іншых краінах – канец XY–XYI стст.), у аснове светапогляду якой ляжыць антропацэнтрызм. Робіцца спроба філасофскага пераасэнсавання сутнасці і прызначэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтва, размежавання царкоўнага і свецкага мастацтва. Фарміруецца новы тып музычнага мыслення – гамафонны. Узнікае новы тып творцы – мастак (а не рамеснік), новая прафесія – кампазітар, новыя жанры – інстументальныя (у галіне музычнага мастацтва) і новая тэхніка – алейнага жывапісу (у галіне выяўленчага мастацтва, распаўсюджваецца ў XVI ст. братамі ван Эйк).

Мастацтва (музычнае і выяўленчае) становіцца абавязковай часткай свецкага выхавання У канцы XYI–пачатку XYII ст. адкрываюцца першыя мастацкая і музычныя навучальныя ўстановы – акадэміі і кансерваторыі ў Рыме, Фларэнцыі, Неапалі, Венецыі. У Вялікім княстве Літоўскім быў адкрыты Віленскі універсітэт (1570 г.), у якім існавалі факультэт мастацтваў і кафедра музыказнаўства.

*У другім параграфе* (2.2. “Першапачатковыя формы і прынцыпы навучання ў мастацкім асяроддзі эпохі Сярэднявечча”) вызначаецца перыядызацыя эпохі Сярэднявечча (Y–XY стагоддзі), якое падзяляецца на Ранняе (Y–IX стст.), Высокае (X–XIII стст.) і Позняе (XIY–XY стст.). Фарміраванне першых дзяржаўных утварэнняў у Беларусі – Полацкага і Тураўскага княстваў (X–XIII стст.) – адпавядаюць такім чынам перыяду Высокага Сярэднявечча. Менавіта ў гэтыя часы на тэрыторыі Беларусі распачаўся працэс распаўсюджвання хрысціянства, ішло інтэнсіўнае будаўніцтва сабораў і манастыроў, амаль пры кожным з якіх мелася школа. Самымі старажытнымі цэнтрамі культуры і адукацыі з’яўляліся хрысціянскія храмы – полацкі Сафійскі сабор (XI ст.) і Спаса-Праабражэнская царква Ефрасіннеўскага манастыра (XII ст.), бельчыцкі Барысаглебскі манастыр (пачатак XII ст.), Благавешчанская царква ў Віцебску (XII ст.), Барысаглебская ў Навагрудку (XII ст.), храмы Тураўска-Пінскіх зямель.

У пачатку XII ст. склалася самабытная школа дойлідства, жывапісу, пластыкі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на Полацкай зямлі, у 60–90-я гады XII ст. існавала самастойная своеасаблівая архітэктурная школа ў Гродне.

Асобна выдзяляецца дзейнасць Прападобнай ігуменні Ефрасінні Полацкай, якая пры заснаваных ею ў Полацку жаночым і мужчынскім манастырах арганізавала вучылішча, дзе навучалі чытанню, пісьму, асноўным прынцыпам хрысціянскага вучэння, Свяшчэннай гісторыі, царкоўным спевам, “цыфіры”, перапісцы кніг, рукадзеллю. Там жа дзейнічалі скрыпторый (майстэрня па перапісванні кніг), багадзельні, аптэкі, а таксама іканапісная і ювелірная майстэрні. Полацкая зямля эпохі Сярэднявечча стала той глебай, на якой сфарміраваліся вытокі баларускага хрысціянскага светаўспрымання, а таксама асновы беларускай культуры і адукацыі, у тым ліку і мастацкай.



Да выдатных дзеячоў эпохі Сярэднявечча адносіцца і Кірыла Тураўскі, якім былі закладзены традыцыі ўрачыстага красамоўства на Беларусі.

Дзейнасць асветнікаў эпохі Сярэднявечча – яскравае адлюстраванне працэсаў, што адбываліся ў сацыякультурным жыцці Беларусі таго часу, калі сінкрэтычнае адзінства фарміравання розных відаў мастацтва ў межах праваслаўнага сабора абумоўлівала пачатак функцыяніравання мастацкай адукацыі.

*У трэцім параграфе* (2.3.”Гуманістычныя тэндэнцыі фарміравання нацыянальнай мастацкай адукацыі ў эпоху Адраджэння”) акрэсліваюцца хранaлагічныя межы эпохі Адраджэння ў Еўропе (XIY–першая палова XYII ст.) і Беларусі, дзе Рэнесансавая культура вызначылася з некаторым спазненнем (XYI–пачатак XYII ст.).

Важнай і адметнай рысай фарміравання мастацкай адукацыі ў эпоху Адраджэння стала распаўсюджванне свецкіх навучальных устаноў як дзяржаўных, так і прыватных (так званае хатняе навучанне). У аснове адукацыйнай сістэмы былі вучэбныя дысцыпліны “сямі вольных навук”, ці “сямі вольных мастацтваў”, якія ўключалі два звязаныя цыклы: “Трывіум” (граматыка, логіка, дыялектыка) і “Квадрывіум” (арыфметыка, геаметрыя, астраномія і музыка).

Арганізацыя новага тыпу адукацыі – свецкія навучальныя ўстановы – адлюстроўвала тыя працэсы, што адбываліся ў грамадстве і ў галіне мастацкай адукацыі, якія вызначыліся ў адстойванні прынцыпаў выхавання вольнага мастака. На працягу XVI ст. пераасэнсоўваліся мастацка-адукацыйныя прынцыпы цэхавых згуртаванняў, іх традыцыйныя погляды на калектыўнае, кананізаванае светаўспрыманне і сцвярджаліся новыя прынцыпы выхавання індывідуальнасці мастака.

Эпоха Адраджэння прынесла Беларусі плеяду шырокавядомых дзеячаў культуры, якія ўнеслі неацэнны ўклад у развіццё літаратуры, мастацтва, філасофскай і грамадска-палітычнай думкі. Гэта Мікола Гусоўскі, Сымон Будны, Андрэй Волан, Васіль Цяпінскі, Андрэй Рымша, Мялецій Сматрыцкі, Стэфаній і Лаўрэнцій Зізаніі і інш.

Пачынальнікам беларускага рэнесансавага асветніцтва быў мысліцель-гуманіст, асветнік, вучоны, першадрукар, пісьменнік Францыск Скарына. Па сваіх светапоглядзе, разуменні, жыццёвых учынках ён стаяў нібыта над эпохай. Ф.Скарына сфарміраваў ідэі, якія ў будучым сталі рэалізоўвацца ў жыцці. Пры выданні сваіх кніг, якія ён разглядаў і як асноўныя дапаможнікі для вывучэння “сямі вольных мастацтваў”, Ф.Скарына ставіў не толькі рэлігійныя, але і асветніцкія мэты – паслужыць простым людзям, дапамагчы ім зведаць духоўную мудрасць і навуку.

Мастацкая адукацыя ў XVI–першай палове XVII ст. фарміравалася на аснове дзейнасці ўстаноў розных канфесій. Навучальныя ўстановы, заснаваныя каталіцкай царквой, так званыя музычныя бурсы, існавалі ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Полацку, Оршы, Віцебску, Нясвіжы, Мінску, Гродне, Слуцку, Магілёве, Навагрудку, Пінску, Слоніме, Юровічах, Мсціславе. Гэта былі своеасаблівыя школы-інтэрнаты, дзе навучаліся дзеці з бедных сем'яў і набывалі прафесійныя навыкі музыканта. У межах каталіцкай канфесіі вялікае значэнне набылі навучальныя ўстановы сярэдняга звяна – калегіўмы і вышэйшыя навучальныя ўстановы – акадэміі. Сярод прадметаў, якія выкладаліся, былі тэорыя музыкі, асновы кампазіцыі, ігра на розных музычных інструментах.

Музычны рэпертуар убіраў у сябе творы не толькі заходнееўрапейскіх кампазітараў, але і беларускіх аўтараў, якія у той час жылі і працавалі ў Беларусі: Вацлаў з Шамотул, Цыпрыян Базылік, Войцах Длугарай, Крыштаф Клабан, Андрэй Рагачэўскі. Асновай фарміравання рэпертуару маглі таксама стаць музычныя нотныя зборнікі XVI–XVII стст. "Віленскі сшытак" і "Полацкі сшытак". Эпоха Адраджэння вызначалася і прыкладамі з'яўлення першых нотадрукаў на Беларусі: Берасцейскага канцыянала Яна Зарэмбы (1558) і Нясвіжскага канцыянала (1563).

Важнымі захавальнікамі праваслаўных традыцый сталі школы і вучылішчы, якія ўзніклі ў канцы XVI ст. пры брацтвах: Магілёўскім – 1590 г., Брэсцкім, Гродзенскім – 1591 г., Аршанскім, Мінскім – 1592 г., Другім Мінскім (Петрапаўлаўскім) – 1613 г. Выкладанне музыкі – музычнай граматы і царкоўных харавых спеваў – было на высокім узроўні. У кожнай школе быў хор, якім кіраваў рэгент, культываваліся шматгалосыя спевы, а таксама наладжваліся тэатралізаваныя прадстаўленні.

Вывучэнне спеваў у брацкіх школах праводзілася сістэматычна на аснове лінейнай нотнай сістэмы. Сярод даследаванняў па тэорыі музыкі можна назваць "Квестионес музика". У другой палове XVII ст. у Беларусі карысталіся і вядомым падручнікам па тэорыі музыкі і тэхніцы шматгалосага харавога пісьма "Мусікійскай граматыкай" Мікалая Дылецкага.

Выпрацоўцы пэўнай сістэмы тэатральнай адукацыі садзейнічалі дыдактычна-выхаваўчыя мэты школьнага тэатра, які распачаў сваю дзейнасць пасля Люблінскай уніі 1569 г. і праіснаваў у Беларусі на працягу XVI–XVIII стст. Школьны тэатр быў своеасаблівым практыкумам у выхаванні паэтычнай (паэтыка), прамоўніцкай (рыторыка) і музычнай культуры.

Выдатным настаўнікам рыторыкі быў філосаф, тэолаг, паэт, тэарэтык літаратуры і красамоўства, музыкант Мацей Сарбеўскі. Ён выкладаў у Полацкай і Нясвіжскай езуіцкіх калегіях, у Віленскай езуіцкай акадэміі, з'яўляўся буйной фігурай у еўрапейскай культуры і значна паўплываў на беларускую лацінамоўную літаратуру, навуку і школьную адукацыю XVII ст. Курсы лекцый М.Сарбеўскага па паэтыцы і рыторыцы надоўга захавалі сваю значнасць у навучальных установах Польшчы, Беларусі, Літвы, Расіі.



У эпоху Адраджэння найбольш актыўна распачаўся працэс развіцця мастацкай адукацыі ў галіне выяўленчага мастацтва. У XVI ст. існавала жывапісная школа пры Барысаглебскай царкве ў Гродне, якую ўзначальвалі Іаан і Афанасій Антановіч, фарміруюцца мясцовыя школы скульптуры, разьбы па дрэве, медальернага мастацтва, кафлярства, графікі са сваім уласным, непаўторным абліччам, адметнай выяўленча-пластычнай стылістыкай. Асобна можна вызначыць беларускую іканапісную школу, якая склалася ў XVI ст. менавіта пад уплывам ідэй Адраджэння на аснове спалучэння рыс візантыйскага і старажытнарускага мастацтва. Аб'яднанні мастакоў – іканапісцаў, разьбяроў, друкароў, гравёраў – існавалі і пры праваслаўных брацтвах.

У Сярэднія вякі (эпохі Сярэднявечча і Адраджэння) былі закладзены асновы сістэмы мастацкай адукацыі ў Беларусі. Разнастайнасць форм мастацкай адукацыі – "вучэнне кніжнае", школы, хатняе навучанне, майстэрні, скрыпторыі, арцелі – сведчаць аб развіцці асноўных форм пачатковага ўзроўню менавіта ў Сярэднія вякі. У гэты перыяд дакладна размежаваліся канфесійныя – праваслаўныя (школы пры Саборах, брацкія школы) і каталіцкія (музычныя бурсы, калегіўмы, акадэмія) – навучальныя ўстановы і былі пазначаны шляхі фарміравання свецкага навучання.

**У трэццяй главе "Фарміраванне прынцыпаў падрыхтоўкі мастака, музыканта, акцёра ў межах культавых і прыватнаўласніцкіх устаноў другой паловы XVII–XVIII ст."** прадстаўлена мастацкая культура эпохі Асветніцтва, ідэі якога на Беларусі распаўсюдзіліся ў другой палове XYIII–пачатку XIX ст. *У першым параграфе* (3.1. "Асаблівасці развіцця мастацкіх стыляў і накірункаў у культуры Новага часу. Эпоха Асветніцтва") разглядаецца класіцызм, які стаў тэарэтычна-светапоглядной асновай мастацкай культуры XVII (баракальны класіцызм) і XVIII (асветніцкі класіцызм) стагоддзяў. У мастацкай адукацыі сінонімам класіцызму стаў акадэмізм. Сфарміраваўся тэрмін "школьны класіцызм", які характарызаваў дзейнасць спецыяльных адукацыйных сістэм (лацінскія гуманітарныя школы, класічныя гімназіі). Класіцызм у тэарэтычным яго разуменні абумоўліваецца рацыянальна-ідэалізіруючым архетыпам мыслення, якое грунтуецца на імкненні да прастаты, яснасці, лагічнасці. Беларускія асветнікі (С.Полацкі, К.Лышчынскі, І.Капіевіч, Г.Каніскі, А.Нарушэвіч, Т.Млоцкі, І.Страйноўскі і інш.) дэкларыравалі адраджэнне простых, гарманічных стылявых форм Антычнасці і рэнесанснага мастацтва, пастуліравалі прынцып рацыянальнага спасціжэння творчасці, вызначалі навучанне ў школе як сродак авалодвання сакрэтамі прамоўніцкага, акцёрскага, музычнага і выяўленчага мастацтва. Сродкам выхавання розума і пачуццяў у Беларусі, як і ў краінах Заходняй Еўропы, стаў школьны тэатр.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Перыяду другой паловы XVII – XVIII стст. належыць важная роля ў развіцці мастацтва, мастацтвазнаўства і мастацкай адукацыі. У еўрапейскіх Акадэміях жывапісу была распрацавана іерархія жанраў жывапісу: ад вышэйшых (алегарычная і гістарычная карціна) – да ніжэйшых (пейзаж, нацюрморт). У музычным мастацтве адбывалася ўсталяванне новых жанраў – опера (у Беларусі распачынала сваё фарміраванне ў прыватнаўласніцкім тэатры), поліфанічныя і гамафонныя інструментальныя формы, сюіта – як форма ў сучасным яе разуменні, так і сам тэрмін-назва (прыкладам такога жанра ў Беларусі могуць стаць “Віленскі сшытак” і “Полацкі сшытак”, XYI–XYII стст.). У XYII ст. упершыню была зроблена спроба вызначэння “почырка” мастака ці мастацкай школы як стылістычнага адзінства мастацкай творчасці. Распрацоўваюцца паняцці стыля, манеры, мастацкіх стылявых школ. У спецыяльную навуку афармляецца гісторыя мастацтва, гісторыя драмы і тэатра, складаецца спецыяльная мастацтвазнаўчая тэрміналогія.

У адпаведнасці з геаграфічным і палітычным становішчам мастацкая культура Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага, развівалася ў агульным рэчышчы фарміравання мастацтваў у еўрапейскіх краінах. На тэрыторыі Беларусі працавалі прадстаўнікі мастацкіх культур Італіі, Францыі, Польшчы, Чэхіі, Расіі, якія надавалі беларускаму мастацтву агульнаеўрапейскія рысы, увасаблялі агульныя мастацкія прынцыпы, традыцыі. Метады мастацкага навучання ў Беларусі былі цесна звязаны ў музычным і тэатральным мастацтве з рэпертуарам, на якім асвойваліся творчыя навыкі. Вобразнасць і тэматыка ствараемых і выконваемых у Беларусі твораў адпавядалі агульнаеўрапейскім канонам.

*У другім раздзеле* (3.2. “Перадумовы фарміравання мастацкай адукацыі ў эпоху Асветніцтва (выкладанне мастацкіх дысцыплін у межах культавых і агульнаадукацыйных устаноў)” выяўляецца новы прынцып функцыяніравання навучальных устаноў у Беларусі, які разглядаецца як пэўная якасная кульмінацыя. Вызначаецца роля Адукацыйнай камісіі (першага ў Еўропе Міністэрства асветы), якая была заснавана ў 1773–1775 г. Навучальным цэнтрам у ВКЛ стала Галоўная школа ВКЛ (Віленскі універсітэт).

Асноўнымі носьбітамі асветніцкай думкі на Беларусі сталі С.Полацкі, Г.Каніскі, І.Капіевіч, К.Лышчынскі. Цэнтральнае месца сярод прадстаўнікоў Асветніцтва ў Беларусі належыць Сімяону Полацкаму – беларускаму і рускаму пісьменніку, філосафу-асветніку, педагогу, царкоўнаму і грамадскаму дзеячу. У яго літаратурнай спадчыне, якая дайшла да нас, ёсць нямала твораў і фрагментаў з іх, дзе разглядаюцца ідэйна-філасофскія і эстэтычныя праблемы мастацкай творчасці. Ён красамоўна абгрунтаваў думку пра духоўна-эстэтычную каштоўнасць музыкі, даказваў неабходнасць для царквы шматгалосых спеваў. Віды



мастацтва ён падзяляў на “механічныя” і духоўнай творчасці (паэзія, музыка і іканапіс).

Вядомым навукоўцам, тэолагам, філосафам, аратарам, музыкантам і педагогам у XVII ст. быў Сігізмунд Лаўксмін. У сваёй разнастайнай дзейнасці шмат увагі ўдзяляў тэатральнай і музычнай адукацыі. Ён выкладаў рыторыку ў Полацку, паэтыку ў Нясвіжы, філасофію, тэалогію і кананічнае права ў Вільні, Бранёве, Полацку (рэктар езуіцкага калегіума), Пінску. С.Лаўксмін стаў аўтарам першых айчынных падручнікаў па грэчаскай мове, рыторыцы і музыцы – “Практычнае красамоўства, або Правілы рытарычнага мастацтва...”, “Ars et praxis musica” (“Тэорыя і практыка музыкі”).

Узмацняецца роля агульнаадукацыйных устаноў у мастацкім выхаванні. Тэатральнае і музычнае выхаванне наладжвалася ў калегіумах, семінарыях, у якіх працягваў развівацца школьны тэатр. У часы барока (XVII–пачатак XVIII стст.) на Беларусі існавала чатырнаццаць езуіцкіх школьных тэатраў: у Полацке, Гродне, Пінску, Віцебску, Навагрудку, Нясвіжы, Мінску, Оршы, Брэсце, Слуцку, Магілёве, Мсціслаўе, у Жодзішках, што каля Смаргоні. У часы Асветніцтва (другая палова XVIII–пачатак XIX ст.). існавала дзевяць езуіцкіх школьных тэатраў: у Бабруйску, Брэсце, Віцебску, Гродне, Навагрудку, Нясвіжы, Пінску, Полацку, Слоніме. Сістэма выхавання школьнага акцёра цесна спалучалася з сістэмай агульнага школьнага навучання. Аўтарамі трагедый з’яўляліся выкладчыкі, даецца апісанне канструкцый сцэны, прынцып мастацкага афармлення спектакля, стварэння касцюма, наяўнасці рэквізіта.

У буйнейшых гарадах Беларусі (Віцебск, Мінск, Магілёў, Гродна) існавалі цэхі жывапісцаў, якія мелі трохступенчатую сістэму: майстар, чаляднік (малер, таварыш) і вучань (хлопец). У межах цэхавых арганізацый ўзнікалі буйныя майстэрні гутнікаў і гравіроўшчыкаў, злотніцтва, “тапісярні”, “персіярні”. Выхаваўча-педагагічнай дзейнасцю займаліся і прыдворныя мастакі, напрыклад, прыдворны мастак Радзівілаў Ксаверый Гескі.

Своеасаблівымі метадычнымі дапаможнікамі пры жывапісным аздабленні храмаў, напісанні ікон, мастацкім афармленні арганаў, інтэр’ераў касцёлаў, сталі так званыя “кажбушкі” – папулярныя гравюры беларускіх, украінскіх, заходнееўрапейскіх старадрукаваных кніжак.

Такім чынам, мастацкая адукацыя ў другой палове XVII – пачатку XVIII ст. значна пашырыла свае функцыі і магчымасці. Больш трывалым робіцца прынцып навучання, які грунтуецца не толькі на ўласнай практыцы выкладчыка, але і на абагульненых палажэннях падручнікаў і дапаможнікаў, якія часта рыхтуюцца самімі педагогамі.

*У трэццім параграфе* (3.3. “Асветніцкія тэндэнцыі фарміравання спецыяльных мастацкіх адукацыйных устаноў свецкага накірунку ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэаліях прыватнаўласніцкіх маёнткаў") раскрываецца дзейнасць першых спецыяльных мастацкіх адукацыйных установаў свецкага накірунку, якія фанкцыяніравалі ў прыватнаўласніцкіх маёнтках Беларусі ў XVIII ст. Вызначаецца плённасць дзейнасці сістэмы мастацкай адукацыі ў Нясвіжы (уладанне Радзівілаў), дзе існавалі балетная і музычная школы. Выкладалі вядомыя ў еўрапейскіх краінах балетмайстры Л.М.Дзюпрэ, Я.Аліўе, Г.Петынеці, прыгонны балетмайстар Антон Лойка, кампазітары і інструменталісты-выканаўцы Д.Кёрнер, Я.Голанд, Я.Дусік, Дж.Альберціні, а таксама шэраг іншых выкладчыкаў, дзейнасць якіх разглядаецца ў дысертацыі. Характарызуецца дзейнасць балетных і музычных школ у Слуцку (Г.Радзівіла), Шклове (С.Зорыча), Гродна і Паставах (А.Тызенгаўза).

Адзначаюцца кантакты ўтрымальнікаў і выкладчыкаў школ са знакамітымі філосафамі эпохі Асветніцтва – капельмайстар шклоўскага аркестра І.Л.Стэфані атрымаў юрыдычную і філасофскую адукацыю ў Кёнігсбергскай акадэміі ў І.Канта; А.Тызенгаўз вёў перапіску з Ж.Ж.Русо; М.К.Агінскі дэманстраваў свае майстэрства выканання на арфе Д.Дзідро, які даў высокую ацэнку яго таленту. М.К.Агінскі супрацоўнічаў і са знакамітай "Французскай энцыклапедыяй".

У параграфе характарызуюцца "Палескія Афіны" – рэзідэнцыя М.К.Агінскага ў Слоніме, дзе еўрапейскую славу набыў "плавальны" тэатр, дзейнасць якога забяспечваў незвычайны Агінскі канал. Слонімскі тэатр стаў прыкладам дасканала абсталяванага познебарочнага тэатра, дзе меўся сцэнічны механізм, які дазваляў паказваць цэлыя эпізоды бітваў на сушы ці на моры. Па сваім тэхнічным забеспячэнні ён пераўзыходзіў Нацыянальны тэатр у Мангейме, параўноўваўся з Венскім і патрабаваў вялікай колькасці музыкантаў, вакалістаў, артыстаў балета, мастакоў-дэкаратараў, бутафораў, кіраўнікоў сцэнічнай машынерыі. Для падрыхтоўкі выканаўцаў існавалі музычная і балетная школы, пэўная сістэма падрыхтоўкі мастакоў.

У XVIII ст. упершыню былі арганізаваны спецыяльныя мастацкія школы, у якіх рыхтаваліся музыканты, танцоры, акцёры, а ў пэўнай ступені і мастакі, дзе закладваліся асновы свецкай мастацкай адукацыі. Упершыню мастацкая адукацыя вылучаецца ў асобны, адметны накірунак дзейнасці чалавека, у межах якога вызначаюцца самастойныя прафесіі выканаўцы, музыканта-інструменталіста, танцора, артыста, мастака, што ў цэлым спрыяе прафесійнаму росту музычнай, тэатральнай, харэаграфічнай, мастацкай культуры Беларусі.

**У чацвёртай главе "Мастацкая адукацыя як самастойная галіна культуры ў Беларусі XIX–пачатку XX ст."** выяўляецца спецыфіка фарміравання сістэмы мастацкай адукацыі азначанага перыяду. *У першым параграфе* (4.1. "Мастацкія плыні і мастацкія школы эпохі рамантызму ў культуры Новага часу") вызначаецца рамантызм – як стылявы накірунак і як эпоха ў культуры. Сярод важнейшых сфер творчасці мастакоў і музыкантаў-рамантыкаў – лірыка, фантастыка, народна- і нацыянальна-самабытнае, натуральнае, характэрнае – выдзяляецца нацыянальна-самабытнае.



Галоўным у разуменні чалавека для рамантыкаў было адчуванне скарбаў душы і сэрца. Адсюль і асэнсаванне сродкаў "пачуццёвага" выказвання - інтанацыя, гук, колер. Асновай эстэтыкі Рамантызму было разуменне сінтэтычнага ўзаемадзеяння жывапісу, музыкі і літаратуры, паняцце сутнаснага адзінства мастацтваў, у якім першанства надавалася музыцы, як самаму эмацыянальнаму мастацтву. Адпаведна фарміруецца і тэрмін "музыказнаўства". У навуцы аб мастацтве узнікае новы тып мастацтвазнаўчых даследаванняў – калетыўныя працы, зацвярджаецца метад параўнальнага аналізу, асноваполагаючай становіцца праблема нацыянальных школ. Вывучэнне мастацтва Новага часу, у прыватнасці XIX ст., грунтуецца на новых навуках – этнаграфіі і фалькларыстыцы. Поруч з найбольш вывучанымі культурамі Італіі, Германіі, Аўстрыі, Францыі вывучаюцца культуры англійская, скандынаўская, а таксама "самастойная славянская школа ў музыцы" (тэзіс А.М.Сярова).

Творчасць беларускіх пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў XIX ст. грунтавалася на прынцыпах "нацыянальнага рамантызму", што раскрывалася праз фальклорныя традыцыі, рамантычную ідэалізацыю вясковага жыцця, апаэтызацыю народнага побыту. Рысы рамантызму выяўляліся ў партрэце (стварэнне вобраза творчай незалежнай асобы), гістарычнай карціне (зварот да падзей мінулага беларускага народа), фартэпіяннай мініяцюры – характэрнай формы эпохі Рамантызму, што сведчыць аб "уваходжанні" беларускіх кампазітараў у агульнаеўрапейскі рамантызм.

Храналагічныя межы эпохі Рамантызму ў Беларусі не адпавядаюць заходнееўрапейскім і могуць быць вызначаны перыядам з пачатку XIX да пачатку XX ст. На мяжы гэтых стагоддзяў назіраліся і рэалістычныя тэндэнцыі ў фарміраванні мастацкай культуры, якія найбольш выразна і вызначана праявіліся ў літаратурна-мастацкім кірунку другой паловы XIX–пачатку XX стст. – крытычным рэалізме.

Фарміраванне нацыянальных мастацкіх школ выявіла супольнасць і блізкасць светаўспрымання кампазітараў, мастакоў, літаратараў, якіх яднаелі агульныя ідэалы рамантыкаў. Мастацкая адукацыя, якая фарміравалася ў адпаведнасці з пэўнай канцэпцыяй мастацкага мыслення, была накіравана на больш дэмакратычнае асяроддзе, навучальныя ўстановы былі колькасна пашыраны і скіраваны на авалоданне спецыяльнымі ведамі. Адзін з галоўных прынцыпаў развіцця мастацкай культуры ў XIX–пачатку XX ст. – выяўленне нацыянальнага і зварот да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народна-дэмакратычных колаў – праявіўся ў мастацкай адукацыі праз арганізацыю самастойных рэгіянальных навучальных устаноў.

*У другім параграфе* (4.2. "Выкладанне мастацкіх дысцыплін у сядзібных і агульнаадукацыйных установах у першай палове XIX ст.") адзначасцца, што шлях развіцця адукацыі ў Беларусі першай паловы XIX ст. суправаджаўся шматлікімі пераменамі ў адміністрацыйна-тэрытарыяльных падзелах навучальнай акругі Паўночна-Заходняга краю: Віленская навучальная акруга (1803–1823), Пецярбургская навучальная акруга (1824–1828), Беларуская навучальная акруга (1829–1850). У 1850 г. была адноўлена Віленская навучальная акруга, у яе склад увайшлі Віленская, Гродзенская і Мінская губерні; Магілёўская і Віцебская губерні былі ўключаны ў Пецярбургскую навучальную акругу, а пазней (з 1864 г.) зноў падпарадкаваліся Віленскай акрузе.

Асноўнымі асяродкамі распаўсюджвання мастацкай культуры былі сядзібныя і агульнаадукацыйныя ўстановы. Вядомасць набылі маёнткавыя тэатры, галерэі, бібліятэкі і прыгонныя мастацкія школы магнатаў Тышкевічаў (Лагойск, Астрашыцкі Гарадок, Плешчаніцы, Свіслач), графа З.Р.Чарнышова (Магілёў, Чачэрск), князёў Сапегаў (Ружаны), меламана і мецэната У.М.Ракіцкага (Гарадзішча пад Мінскам).

Мастацкая адукацыя развівалася і ў межах сістэмы агульнай адукацыі. Цікавасць выклікае вопыт ланкастэрскага (узаемнага) навучання. На Беларусі былі вядомы 13 такіх школ, якія належалі М.Румянцаву, Д.Манюшку (дваюраднаму брату С.Манюшкі), І.Храпавіцкаму, А.Храптовічу і іншым.

Пэўную ролю ў распаўсюджванні мастацкіх ведаў адыгралі пансіёны, росквіт дзейнасці якіх прыпадае на 20–50 гады XIX ст. Яны існавалі ў Мінску, Пінску, Гомелі, Віцебску, Полацку, Слуцку, Мсціслаў, Беластоку, Брэсце, Гродне і інш. Сярод мінскіх пансіёнаў вылучаўся і быў прызнаны ўзорным пансіён Людвіка і Марыі Мантэграндзі. Яго выхаванкай была беларуская піяністка, кампазітар і педагог Каміла Марцінкевіч (дачка В.Дуніна-Марцінкевіча). Вядомым быў пансіён Д.Стэфановіча, у якога пачыналі сваю музычную адукацыю С.Манюшка, Ф.Міладоўскі.

Традыцыі выкладання музыкі захоўваліся ў семінарыях і гімназіях, дзе ўвадзілася вывучэнне тэарэтычных прадметаў, методыкі выкладання і абавязковага выканання на скрыпцы. Вызначаюцца Слуцкая, Мінская мужчынская на Высокім рынку, Гродзенская, Мозырская, Свіслацкая гімназіі, у якіх выкладалі вядомыя беларускія мастакі і музыканты.

Вызначаецца роля Полацкай езуіцкай акадэміі (1812–1820) і Віленскага універсітэта, у якім існаваў факультэт мастацтваў (1797–1832, умоўная назва - Віленская мастацкая школа) з кафедрамі жывапісу (кіраўнікі Ф.Смуглевіч, Я.Рустэм), скульптуры (кіраўнік К.Ельскі) і гравюры (кіраўнікі І.Вейс, Дж.Сандэрс, М.Падалінскі). У Віленскім універсітэце з



1803 (1802?) г. існавала і кафедра музыказнаўства, якую ўзначальваў Я.Голанд. Характарызуюцца выхаванцы Віленскага універсітэта, сярод якіх вылзяляецца Н.Орда як тыповы прадстаўнік эпохі рамантызму, які сінтэтычна спалучаў талент піяніста, кампазітара, мастака, педагога, музычнага пісьменніка, тэарэтыка, грамадзянскага дзеяча. Аналізуецца яго падручнік "Граматыка музыкі, ці Тэарэтычнае і практычнае выкладанне мелодыі і гармоніі з кароткім дадаткам пра фугу, кантрапункт, аркестравыя інструменты, арган, фартэпіяна і пра навуку спеваў для піяністаў".

У першай палове XIX ст. завяршыўся працэс развіцця мастацкай адукацыі ў маёнткавых і сядзібных установах, перасталі іграць вядучую ролю і агульнаадукацыйныя установы.

*У трэцім параграфе* (4.3. "Фарміраванне ўстаноў спецыяльнай мастацкай адукацыі ў другой палове XIX-пачатку XX ст.") канстатуецца, што працэс авалодання ведамі, уменнямі і навыкамі ў розных відах мастацтва набываў пэўную сістэматычнасць і здзяйсняўся праз розныя віды навучальных устаноў. Па сваім узроўні ў гэты перыяд яны адпавядалі пачатковаму і сярэдняму ўзроўню мастацкай адукацыі. Выхаванне мастакоў і музыкантаў здзяйснялася праз такія формы, як хатняе навучанне, прыватныя ўрокі і студыі, музычныя і мастацкія школы, спецыяльныя класы пры разнастайных таварыствах аматараў прыгожых мастацтваў, школы-майстэрні (пачатковы ўзровень), вучылішчы (сярэдні ўзровень). Аналізуецца дзейнасць музычных (Т.Сіпайла ў Гомелі, С.Шацкінай у Мінску), мастацкіх школ (Ю.Пэна ў Віцебску, Я.Кацэнбогена і Я.Кругера ў Мінску), вакальных студый (Н.Муранскай у Мінску, Ю.Рэйдэр у Магілёве), Віленскай рысавальнай школы І.Трутнева і інш.

Вызначаецца роля літаратурна-музычных гурткоў і таварыстваў аматараў прыгожых мастацтваў, пры якіх адкрываліся музычныя класы, арганізоўваліся выставы (першая мастацкая выстава ў Беларусі была арганізавана ў 1891 г. у Мінску, усяго у перыяд з 1890 г. па 1917 г. у гарадах Беларусі было арганізавана больш за 10 мастацкіх выстаў, на якіх экспанаваліся творы мясцовых мастакоў.).

У канцы XIX–пачатку XX стст. былі адкрыты дзве сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы – Мінскае вучылішча арганістаў (1871–1897, ініцыятар заснавання Ф.-Ф.Я.Сенчыкоўскі) і Мінскае музычнае вучылішча (1907, ініцыятар заснавання скрыпач Н.Рубінштэйн).

У XIX–пачатку XX ст. сфарміраваліся спецыяльныя мастацкаадукацыйныя гарадскія навучальныя ўстановы двух ўзроўняў – пачатковага (хатняе навучанне, прыватныя ўрокі, студыі, курсы, школы) і сярэдне-спецыяльнага (вучылішчы). У выніку ў мастацкай культуры сфарміравалася самастойная галіна – мастацкая адукацыя і самастойная прафесія – выкладчык мастацкіх дысцыплін. Вынікам навучання ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыяльных вучэбных установах былі абавязковыя публічныя выпрабаванні вучняў – канцэрт ці выстава – на падставе чаго звычайна давалася кваліфікацыя выкладчыка музычных школ ці настаўніка малявання і чарчэння.

**У пятай главе "Станаўленне сістэмы мастацкай адукацыі ў Беларусі XX ст."** аналізуецца фарміраванне сістэмы мастацкай адукацыі савецкага і постсавецкага часу. *У першым параграфе* (5.1. "Асаблівасці развіцця мастацкай культуры і мастацкай адукацыі Навейшага часу") разглядаюцца сацыяльныя асновы новага савецкага грамадства ў першыя два дзесяцігоддзі яго існавання, якія абумовілі адкрытасць, разнастайнасць, свабоду мастацкага выказвання. Менавіта таму ў 20-я гады так віталіся новыя мастацкія стылі і накірункі, у аснове якіх ляжаў авангардызм – мастацкі рух, які аб'яднаў многіх мастакоў XX ст.

Дзейнасць мастакоў-авангардыстаў і развіццё авангардных накірункаў, плыняў, аб'яднанняў і груповак у Савецкім грамадстве было абмежавана і перапынена пасля выхаду Пастанаўлення ЦК ВКП(б) ад 23 красавіка 1932 г. "Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый", у якім упершыню з'явіўся тэрмін "сацыялістычны рэалізм". Былі створаны творчыя саюзы – савецкіх пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, кінематаграфістаў. У аснову іх дзейнасці быў пакладзены метад "партыйнасці, ідэйнасці і народнасці", што прыводзіла да абмежавання творчага дыяпазону творцаў. Сацыялістычны рэалізм застанецца ў гісторыі мастацтва як сацыякультурны феномен мастацтва эпохі станаўлення і развіцця сацыялістычнага грамадства.

Працэс абнаўлення стылістыкі савецкага мастацтва, у якім пераважала яго ідэйна-агітацыйная сутнасць, уплываў і на фарміраванне сістэмы мастацкай адукацыі. З аднаго боку, яна стала сапраўды народнай, масавай (з пункту гледжання сацыяльнага распаўсюджвання і шырыні ахопу народных мас), з другога боку, не была пазбаўлена прапагандысцкіх мэтаў навучання.

На фарміраванне сістэмы мастацкай адукацыі Навейшага часу ўплывалі некалькі састаўляючых: сацыяльныя рэаліі, размах пошукаў новых форм і магчымасцей навучальных устаноў, гатоўнасць і жаданне народных мас атрымаць мастацкую адукацыю, спалучэнне пры арганізацыі мастацкай адукацыі старых (класічных – школы, вучылішчы) і новых (сучасных, савецкіх – рабочыя студыі, клубы) форм мастацкага выхавання і адукацыі. Яны перапляталіся, узаемадзейнічалі, узаемаразвіваліся. У выніку – у 30-50-я гады XX ст. на Беларусі склалася адносна стабільная сістэма мастацкай адукацыі, якая ў далейшым пашыралася і ўдасканальвалася.

*У другім параграфе* (5.2. "Пошукі новых формаў мастацкай адукацыі ў сацыякультурных умовах другога дзесяцігоддзя XX ст.") характарызуюцца 20-я гады як перыяд вялікіх пераўтварэнняў, часам, у які фарміраваліся і



дзейнічалі разнастайныя мастацкія накірункі, стылі, творчыя школы, аб'яднанні. У галіне беларускай мастацкай культуры гэта быў найцікавейшы перыяд, падчас якога рэалізаваліся шырокія асветніцкія і выхаваўчыя магчымасці мастацтва, сфарміраваліся падставы для эксперыментальнага пошуку мастакоў, музыкантаў, дзеячаў тэатра, былі створаны ўмовы для арганізацыі пашыранай цэласнай адукацыйнай сістэмы.

Адной з важнейшых у гэтыя часы паўстала праблема падрыхтоўкі кадраў высокакваліфікаваных спецыялістаў. Былі прыняты дэкрэты аб перадачы выхавання і адукацыі дзяржаве. На пачатку 20-х гадоў найбольш тыповымі і распаўсюджанымі адукацыйнымі ўстановамі былі студыі, народныя кансерваторыі, мастацка-практычныя інстытуты. Акцёрскія студыі арганізоўваліся пры тэатрах – БДТ-2 у Віцебску, пры Беларускім дзяржаўным тэатры (стала працаваць у 1921 г. у Маскве). Мастацкія студыі адкрываліся ў Магілёве, Віцебску, Гомелі (імя М.А.Урубеля), Мінске (Я.Кругера, Г.Віера, А.Тычыны).

Найбольш цікавым з'яўляецца феномен мастацкага Віцебска. З 1918 г. па 1922 г. у ім жылі і працавалі вядомыя лідэры авангардызму, арганізатары і стваральнікі "новай" школы мастацтва Казімір Малевіч, Марк Шагал, Л.Лісіцкі, В.Ермалаева і іншыя эксперыментатары новых формаў мастацтва. Была адкрыта (1918) Віцебская школа "новага рэвалюцыйнага ўзору", якая з прыездам ў Віцебск К.Малевіча была пераўтворана ў 1920–1921 гг. у Дзяржаўныя мастацкія тэхнічныя майстэрні. К.Малевіч арганізуе паслядоўна два аб'яднанні – Посновис і Уновис, тэарэтычным падмуркам якіх стаў прынцып калектыўнай творчасці.

Імкненне да большага пашырэння музычнага, тэатральнага, выяўленчага мастацтваў, зварот да розных сродкаў прапаганды нараджалі разнастайнасць формаў мастацкай адукацыі і асветы. Вельмі моцнае было жаданне выйсці на ўзровень вышэйшай адукацыі. Пакуль што, у пачатку 20-х гадоў, гэта магчыма было зрабіць толькі ўмоўна, што адлюстравалася ў назвах вучэбных устаноў. У межах выяўленчага мастацтва гэта быў мастацка-практычны інстытут (Віцебск, 1921 г.), у межах музычнага мастацтва – народныя кансерваторыі (Віцебск – 1918 г., Гомель – 1919 г. Мінск – 1919 г., Бабруйск – 1921 г.). На базе народных кансерваторый былі адкрыты музычныя тэхнікумы (Віцебск – 1922 г., Мінск – 1924 г.). Музычныя школы адкрываліся ў розных гарадах Беларусі: Магілёве (1919), Гомеле (1923), Мінску (1926), Бабруйску (1927) і інш.

Мастацкая адукацыя ў Беларусі ў 20-я гг. XX ст. набыла стройную сістэму, што дало рэальныя падставы для станоўчага вырашэння пытання аб адкрыцці ў рэспубліцы вышэйшых навучальных устаноў – кансерваторыі і тэатральна-мастацкага інстытута.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*У трэцім параграфе* (5.3. "Стварэнне дзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў як важны этап фарміравання сістэмы мастацкай адукацыі ў 30–50-я гады XX ст") сцвярджаецца, што цэласная сістэма дзяржаўнай мастацкай адукацыі ў Беларусі сфарміравалася ў сярэдзіне XX ст. Адукацыя ў розных відах мастацтва мела свае кульмінацыйныя пункты, якія суадносіліся з датай адкрыцця вышэйшых навучальных устаноў – Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі (1932) і паасобку факультэтаў тэатральнага (1945), мастацкага (1953) у Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце.

Тэрмін арганізацыі вышэйшых навучальных і сярэдніх спецыяльных (харэаграфічнае вучылішча было адкрыта ў 1945 г.) мастацкіх устаноў абумоўліваўся ўзроўнем прафесійных дасягненняў у галіне мастацкай культуры, сістэматычнасцю педагагічных метадаў, стабільнасцю бытавання і выніковасцю дзейнасці музычных, харэаграфічных, тэатральных і мастацкіх школ і вучылішчаў у гарадах Беларусі.

У параграфе падрабязна аналізуецца дзейнасць Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі ў першыя гады яе функцыяніравання, падкрэсліваецца значэнне кафедры гісторыі, тэорыі і кампазіцыі (загадчык В.Залатароў) для станаўлення беларускай нацыянальнай кампазітарскай школы, а таксама аддзяленняў народных, струнных, духавых інструментаў, фартэпіяна, вакальнага, інструктарска-педагагічнага і музычнага выхавання ў комплексе іх вучэбнай, навукова-даследчай, вучэбна-метадычнай, канцэртнай дзейнасці.

Тэатральная адукацыя, хаця і развівалася ў асноўным у межах студыйна-практычнага выхавання, разам з тым рабіла і пэўныя крокі на шляху больш сталай і прафесійнай падрыхтоўкі кадраў. У 1931–1933 гг. у Мінску працаваў тэхнікум сцэнічнага мастацтва. У 1938 г. было адкрыта рэспубліканскае тэатральнае вучылішча, (праіснавала да 1941 г.) з двума аддзяленнямі – драматычным і харэаграфічным.

Такім чынам, да канца 30-х гадоў у Беларусі ў межах мастацкай адукацыі ўжо існавалі вышэйшая навучальная ўстанова – кансерваторыя, сярэднія навучальныя ўстановы: шэсць музычных вучылішчаў, мастацкае і тэатральнае вучылішчы, пачатковыя навучальныя ўстановы – 19 музычных школ, шэраг тэатральных і мастацкіх студый.

Своеасабліва развівалася культура і адукацыя Заходняй Беларусі да аб'яднання яе ў 1939 г. з БССР. Адзначаецца дзейнасць Я.Драздовіча.

У параграфе разглядаецца дзейнасць Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, пачатак функцыяніравання якога звязаны з тэатральным факультэтам. Адзначаецца дзейнасць кафедр майстэрства акцёра, рэжысуры, а з адкрыццём мастацкага факультэта – кафедр жывапісу, скульптуры, графікі, на аснове якіх сфарміраваны два сучасныя факультэты: мастацкі і дызайну.



Такім чынам, у сярэдзіне XX ст. у Беларусі сфарміравалася цэласная стабільная дзяржаўная сістэма мастацкай адукацыі, якая стала фундаментам для далейшага ўдасканалення метадаў і формаў навучання ў межах традыцыйных відаў мастацтва, а таксама развіцця новых адукацыйных спецыяльнасцей ў галіне тэхнагенных мастацтваў.

Па сваёй структуры сістэма мастацкай адукацыі ахоплівае тры асноўныя адукацыйныя ўзроўні: пачатковы, сярэдні спецыяльны, вышэйшы. Па змесце яна раскрываецца ва ўсіх мастацкіх спецыяльнасцях, якія абумоўліваюць актуальнае і перспектыўнае развіццё мастацкай культуры Беларусі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Аснову тэарэтычных высноў складаюць палажэнні, якія пацвярджаюць прапанаваную аўтарам гіпотэзу:

1. Упершыню ў мастацтвазнаўстве разгледжана **мастацкая адукацыя ў Беларусі як цэласная сістэма** навучальных працэсаў у межах традыцыйных відаў мастацтва (музычнага, тэатральнага, выяўленчага), якая з'яўляецца **падсістэмай нацыянальнай мастацкай культуры.** [8, 2, 47, 43, 6]

2. Вызначаны асноўныя гістарычныя **этапы** працэса **фарміравання сістэмы мастацкай адукацыі** ў Беларусі (за перыяд **тысячагоддзя** (XI–XX стст.).: 1 – вытокі мастацкай адукацыі і развіццё **першапачатковых форм навучання** ў XI–XVII стст. (эпохі Сярэднявечча, Адраджэння); 2 – фарміраванне **спецыяльнай мастацкай адукацыі** ў межах **культавых і свецкіх прыватнаўласніцкіх** навучальных устаноў у другой палове XVII–XVIII стст. (эпоха Асветніцтва); 3 – функцыяніраванне **мастацкай адукацыі як самастойнай галіны мастацкай культуры** ў XIX–пачатку XX ст. (эпоха Рамантызму); 4 – станаўленне **дзяржаўнай сістэмы мастацкай адукацыі** ў Беларусі ў XX ст.

**Структурна-функцыянальныя асаблівасці** сістэмы мастацкай адукацыі ў Беларусі выяўлены двухбакова: з пункту гледжання **агульнага сацыякультурнага працэсу** развіцця мастацтва і з пункту гледжання **індывідуальнага** ўклада буйных мастакоў, прадстаўнікоў асветніцка-філасофскай думкі, дзяржаўных і творчых асоб.

У часы **Сярэдніх вякоў** больш вызначальнымі былі **агульныя заканамернасці** развіцця культуры, дзе дамініравала функцыянальнае канфесіянальнае яе прызначэнне, падпарадкаванне – адпаведна хрысціянскаму веравызнанню – хрысціянскаму храму, культавым цэнтрам розных канфесій. Індывідуальнасць творцы, мастакі звычайна не пазначаліся. У перыяд **Новага часу** вызначальнымі былі **як агульназначныя** сацыякультурныя заканамернасці развіцця культуры

(прыватнаўласніцкай, палацавай, сядзібнай – XYIII ст., гарадской XIX пачатак XX стст.), **так і ўклад асобных індывідуальнасцей** – таленавітых творцаў, уладальнікаў маёнткавых тэатраў, капэл, музычных, балетных і мастацкіх школ, мецэнатаў. У **Навейшы час** (XX ст) першаснае значэнне набывае **індывідуальнасць,** якая ва ўмовах сфарміраваўшайся Беларускай дзяржавы фарміруе вызначаныя мастацкія школы, накірункі і стылістыку.[44, 42, 47, 46]

3. Прааналізаваны ў гісторыка-тэарэтычным аспекце **працэс пераемнасці** ў станаўленні сістэмы мастацкай адукацыі, якi абумовiў развіццё **тыповых форм адукацыі** (школа, вучылішча (каледж), акадэмія, універсітэт), і **фарміраванне вызначаных метадаў і спосабаў** мастацкага навучання.

Эвалюцыя гэтых форм адукацыі і метадаў выкладання дае магчымасць раскрыць **стадыяльнасць працэса** станаўлення сістэмы мастацкай адукацыі: **ад сінкрэтызму** яе відаў (у адпаведнасці з традыцыйнымі відамі мастацтва) на першапачатковым этапе развіцця – **праз відавую дыферэнцыяцыю** і вузкапрафесійную спецыялізацыю – **да новага ўзроўню сінтэзу** мастацкіх ведаў і творчых спецыяльнасцей на сучасным этапе.

**Працэс пераемнасці мастацкага навучання** базіруецца **на двух фактарах**: 1 – абавязковае **асваенне класічных, кананізаваных, акадэмічных асноў** (у выяўленчым мастацтве гэта малюнак, колер, кампазіцыя, у музычным - мелодыя, рытм, гармонія, у тэатральным – слова, жэст, рух, а для ўсіх - абавязковае вывучэнне формы, жанра і адпаведных спецыяльнасці сродкаў выразнасці і выказвання); 2 – **выхаванне прафесіяналізму (артыстызму) з улікам стылявых асаблівасцей мастацкай культуры пэўнага перыяду.** Кожны навучэнец паступова асвойвае ў сваім індывідуальным развіцці класічныя і сучасныя асновы прафесіі на ўсіх узроўнях адукацыі – пачатковым, сярэднім, вышэйшым.[16, 18, 19, 21, 24, 28, 29, 44, 42, 11]

**4. Вызначана структурная іерархія** мастацкай адукацыі. У якасці асноўных **структурных элементаў** фарміруюцца **тры узроўні: пачатковы, сярэдні спецыяльны, вышэйшы.** Яны звязаны як з узростам навучэнцаў, так і з мэтамі навучання, непарыўна ўзаемадзейнічаюць, параджаюць мноства **варыянтаў форм**, з'яўленне і функцыяніраванне якіх абумоўлена гісторыка-сацыяльнымі рэаліямі. Так, пачатковы ўзровень раскрываўся ў варыянтах форм – школа, хатняе навучанне, студыі, класы. Сярэдні спецыяльны - вучылішчы, каледжы, ліцэі. Вышэйшы ўзровень - інстытуты, кансерваторыя, акадэміі, універсітэты. Кожны з гэтых варыянтаў мае сваю непаўторную каштоўнасць, сацыякультурную і гістарычную значнасць, што ў цэлым уплывае на ўдасканаленне з цягам часу сістэмы мастацкай адукацыі.



Тыповыя формы маюць дакладныя патрабаванні да **ўзросту навучэнцаў і ўзроўню іх творчай падрыхтоўкі**. Названыя тыповыя формы мастацкай адукацыі існуюць незалежна адзін ад аднаго, самастойна, але звязаны **паслядоўнасцю і пераемнасцю навучання**.

Узроўні і формы, якія вызначаюць сістэму мастацкай адукацыі, з'яўляюцца неабходнымі і дастатковымі для здзяйснення мастацкай адукацыі ў непарыўным яе развіцці і ўдасканаленні. **Дыялектыка школы, вучылішча і ВНУ указвае на іх адносную самастойнасць і завершанасць**, з аднаго боку, **і на ўзаемадзеянне і ўзаемазалежнасць**, з другога. У выніку – менавіта іх спалучэнне і параджае **сістэмнасць мастацкай адукацыі, як феномен выхавання творчай індывідуальнасці.** [27, 28, 29, 9, 10]

5. Выяўлена **роля мастацкай адукацыі ў станаўленні і развіцці беларускай мастацкай культуры** (як прафесійнай, так і аматарскай), акрэслена **значэнне мастацкай адукацыі для фарміравання асобы мастака** (як творцы, так і педагога), вызначана **сацыяльная значнасць мастацкай адукацыі ў фарміраванні мастацкага асяроддзя**.

Станаўленне арганізацыйных форм і ўзроўняў сістэмы мастацкай адукацыі абумоўлена сацыякультурным развіццём дзяржавы. **Унутраныя працэсы** фарміравання **сістэмы мастацкай адукацыі ў Беларусі адлюстроўвалі агульныя заканамернасці** развіцця **мастацкай культуры** як нашай краіны, так і іншых краін Еўропы. Таму аналіз эвалюцыі музычнай, тэатральнай, мастацкай адукацыі даў магчымасць стварэння больш цэласнай карціны гісторыі мастацкай культуры Беларусі як часткі Еўропы за тысячагадовы перыяд.

Разнастайнае ўзаемадзеянне мастацкай культуры і мастацкай адукацыі на розных этапах гістарычнага развіцця Беларусі параджае разнастайнасць форм мастацкай адукацыі. Працэс гісторыка-культурнага станаўлення сістэмы мастацкай адукацыі ў Беларусі адлюстроўвае заканамернасці фарміравання традыцый культуры як іншых краін Заходняй і Ўсходняй Еўропы, так і своеасаблівай і багатай нацыянальнай беларускай мастацкай культуры. У гэтым раскрываюцца арыгінальныя рысы **мастацкай адукацыі ў Беларусі** і магчымасць яе разгляду **на ўзроўні агульнаеўрапейскіх ці сусветных стандартаў**.[48, 47, 43, 11]

6. Практычную значнасць даследавання вызначаюць **асэнсаванне цэласнасці сістэмы** мастацкай адукацыі ў Беларусі, увядзенне, абагульненне і сістэматызацыя фактаалагічнага матэрыялу, што дазволіла **аб'ёмна і шматбакова разгледзець працэс развіцця мастацкай культуры ў Беларусі** за тысячагоддзе (XI–XX стст.)

Вопыт развіцця мастацкай адукацыі ў Беларусі звязаны з **індывідуальным вопытам творчасці мастакоў, музыкантаў, дзеячоў тэатра** як мясцовага паходжання, так і прадстаўнікоў культур краін

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заходняй Еўропы, Расіі. Разглядаючы іх разнастайную, разнастылевую, шматфункцыянальную дзейнасць у адзінай сістэме мастацкай адукацыі вызначаецца **сацыяльна-эстэтычны, каштоўнасны сэнс мастацкай адукацыі, як фактара станаўлення духоўнай культуры Беларусі**. Вырашэнне праблем мастацкага выхавання і адукацыі патрабуе глыбокага аналітычнага асэнсавання сутнаснай ролі мастацкай культуры ў грамадстве, яе сацыяльна значнай высока духоўнай накіраванасці. Прафесійнае мастацтва вымагае падрыхтоўкі прафесійнага майстра, забеспячэння непарыўнай змены пакаленняў творцаў.[14, 30, 33, 36, 45, 37, 38, 12]

7. Неад'емнасць фарміравання мастацкай адукацыі і мастацкай культуры ў сацыяльных умовах пэўных гістарычных эпох, непарыўнасць і маштабы іх узаемадзеяння, іх узаемаабумоўленае развіццё сведчаць аб значнасці і пераемнасці працэсаў, што адбываліся ў сацыякультурным жыцці Беларусі ў XI–XX стст. Вызначальная роля мастацкай адукацыі ў выхаванні творчай індывідуальнасці, фарміраванні майстра, стварэнні прафесійнага мастацкага патэнцыялу вырашае важную задачу забеспячэння непарыўнай змены пакаленняў творцаў розных відаў мастацтва.

Праз сучасную мастацкую адукацыю рэалізуюцца сацыяльна-функцыянальныя патрэбы грамадства, у адпаведнасці з якімі не толькі **ўдасканальваюцца традыцыйныя спецыяльнасці** (у межах музычнага, тэатральнага, выяўленчага мастацтваў), але і **фарміруюцца новыя, тэхнагенныя, аўдыёвізуальныя** – кіна- і тэлерэжысёр, кіна- і тэлеаператар, акцёр экрана, тэлевядучы, дызайнер, менеджэр мастацкай культуры, камп'ютэрная аранжыроўка музычнага твора, камп'ютэрная графіка і інш.

"Абнаўленне" ў XX ст. традыцыйных відаў мастацтва з дапамогай радыё, кіно, тэлебачання, аўдыё- і выдыётэхнікі, сучаснай віртуальнай культуры не толькі вядзе да **новых сродкаў тыражыравання і распаўсюджвання твораў** выяўленчага, тэатральнага мастацтва, музыкі ў шырокім сацыяльным асяроддзі, але і высоўвае новыя мастацкія задачы **стварэння тэхнагенных, сучасных кампазіцый, форм, жанраў.** Сучасная мастацкая адукацыя як частка мастацкай культуры памежжа XX–XXI стагоддзяў таксама ўсё больш рэалізуецца праз глабальную віртуальную інфармацыйную сістэму.

Пашырэнне і ўсталяванне новых спецыяльнасцей у сістэме мастацкай адукацыі на мяжы XX–XXI ст. дэманструе яе вялікія творчыя магчымасці, з дапамогай якіх ва ўсе сферы мастацкага жыцця ўводзіцца **новы прафесійны вопыт**, пераасэнсоўваюцца мастацкія праблемы, **рэалізуюцца новыя адукацыйныя магчымасці, удасканальваюцца адукацыйныя формы** – як традыцыйныя, так і новыя, тэхнагенныя.[2, 3, 4, 5, 43]



8. **Навейшы час** стаў эпохай, калі з'явіліся невядомыя раней **сінтэтычныя віды мастацтва** – кіно, радыё, фота, тэлебачанне, камп'ютэрныя віртуальныя рэаліі. Развіццё і ўдасканальванне гэтых тэхнагенных мастацтваў на працягу XX ст. стала адлюстраваннем сацыяльнай патрэбнасці ў **новым мастацкім мадэляраванні жыцця**, адпаведнасці канструктыўных магчымасцей "века тэхнічнай рэвалюцыі" спосабам мастацкага выказвання. Гэтыя сінтэтычныя віды мастацтва патрабуюць сінтэзавання мастацкіх ведаў і ад мастакоў і ад мастацтвазнаўцаў, і, вядома, ад педагогаў і вучняў у галіне мастацкай адукацыі.

Разам з тым і **традыцыйныя віды мастацтва** ў сучасным іх успрыманні (як класіка мінулых эпох, так і сучасныя творы) вызначаюць неабходнасць **гарманічнага цэласнага вывучэння гісторыі і тэорыі мастацтваў.** Вывучэнне мастацкай культуры комплексна – у адзінстве сацыяльных, культуралагічных, стылявых, адукацыйна-асветніцкіх, нацыянальных і інш. асаблівасцей дае магчымасць больш цэласна акрэсліць спецыфіку кожнага з традыцыйных відаў мастацтва – тэатральнага, музычнага, выяўленчага – і **дыялектыку іх узаемадзеяння**.[2, 47, 6]

9. Тэндэнцыя да **сінтэзавання мастацкіх ведаў** абумовіла ўвядзенне ў навучальныя праграмы сярэдніх навучальных устаноў у пачатку 90-х гадоў XX ст. такой дысцыпліны як **"сусветная мастацкая культура"**. Адпаведна пачалася падрыхтоўка выкладчыцкіх кадраў. У Беларускім універсітэце культуры рэзультатыўна працуе спецыялізацыя **"выкладчык сусветнай і айчыннай мастацкай культуры"**, у межах якой выкладаюцца гісторыя, тэорыя і аналіз усіх відаў мастацтва. Як вынік – у тэарэтычных дыпломных працах, магістарскіх, кандыдацкіх і доктарскіх дысертацыях усё шырэй **выкарыстоўваюцца аналітычныя прынцыпы, сістэмнасць аналізу, метадаў, формы вывучэння розных відаў мастацтва ў іх супастаўленні і параўнанні**. Аналагічная спецыялізацыя існуе і ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце.

Магчымасць сінтэтычнага вывучэння розных відаў мастацтва абумовілася **фарміраваннем цэласнай сістэмы мастацкай адукацыі ў Беларусі, якая ў другой палове XX ст. набыла стабільнасць формы, узаемазвязаныя узроўні, вызначаны змест і значныя дасягненні.** Сінтэтычнае спалучэнне відаў мастацтва ў вывучэнні гісторыі і тэорыі мастацкай культуры абумоўлена сучаснай мастацкай рэчаіснасцю.[9, 2, 47, 9]

10. **Перспектывы** развіцця сістэмы мастацкай адукацыі звязаны з далейшым удасканаленнем навучання ў межах традыцыйных відаў

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

мастацтва шляхам іх сінтэзавання і найболып поўнай (пашыранай) тэхнагеннай аснашчанасці. Метады цэласнага аудыё- і відыёзабеспячэння гісторыка-тэарэтычных курсаў у галіне мастацтва абумовяць фарміраванне гукава-прасторавага прадстаўлення (а не толькі мастацкага ўяўлення) аб пэўным мастацкім творы, стылістычнай гукавай ці колеравай гаме вызначанай эпохі ў мастацкай культуры, аблегчаць і аптымізуюць працэс пазнання сусветнай культуры. Найболып перспектыўным у гэтым плане можа стаць выкарыстоўванне камп'ютэра. Камп'ютэрныя рэаліі ўводзяць не толькі ў свет мінулага, нібыта ў рухе рэпрадуцыруюць падзеі мастацкай старажытнасці, але і рэалізуюць у аб'ёмным, прасторавым і гукавым праяўленнях творчыя фантазіі сучаснага мастака. Спалучэнне патрэб вывучэння традыцыйнай мастацкай культуры і выкарыстання новых тэхнагенных магчымасцей дае падставу для далейшага развіцця працэсу сінтэзавання спецыяльнасцей. Пачаткам гэтага можна лічыць адкрыццё (у 1997 г.) у Беларускім універсітэце культуры спецыяльнасці "Камп'ютэрныя сістэмы ў культуры".[2, 9]



## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ


**Манаграфіі**

1. Масленікава В.П. Музычная адукацыя ў Беларусі / Рэд. Б.С.Смольскі. Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 112 с.: іл.

2. Пракапцова В.П. Мастацкая адукацыя ў Беларусі. – Мінск: Бел. ун-т культуры, 1999. – 210 с.

**Вучэбныя дапаможнікі**

3. Фартэпіянныя мініяцюры беларускіх кампазітараў: Вучэб. дапам. (хрэстаматыя) для музычных школ і вучылішчаў: У 2 ч./ Укл. В.П.Пракапцова (навук. кіраўнік) і інш. – Мінск: Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 79 с.

4. Фартэпіянныя мініяцюры беларускіх кампазітараў: Вучэб. дапам. (хрэстаматыя) для музычных школ і вучылішчаў: У 2 ч./ Укл. В.П.Пракапцова (навук. кіраўнік) і інш. – Мінск: Беларусь, 1996. – Ч. 2 (сшытак 1). – 80 с.

5. Фартэпіянныя мініяцюры беларускіх кампазітараў: Вучэб. дапам. (хрэстаматыя) для музычных школ і вучылішчаў: У 2 ч./ Укл. В.П.Пракапцова (навук. кіраўнік) і інш. – Мінск: Беларусь, 1996. – Ч. 2 (сшытак 2). – 96 с.

6. Пракапцова В.П. Мастацкая адукацыя ў Беларусі: Вып. мультымедыйнай серыі "Культура Беларусі. Лепшыя старонкі" – тэхнічная распрацоўка аўтарскага калектыву "Артмультымедыа". – Мінск: БелІПК, Copyright, 2000.

**Артыкулы ў навуковых зборніках і рэцэнзуемых часопісах**

7. Масленікава В.П. З гісторыі музычнай культуры Беларусі // Весці Акад. навук БССР. Сер. гуманітар. навук. – 1974. – № 5. – С. 109–117.

8. Масленікава В.П. Музычная адукацыя ў Беларусі // Весці Акад. навук БССР. Сер. гуманітар. навук. – 1975. – № 4. – С. 102–109.

9. Пракапцова В.П. Двухадзінства // Мастацтва. – 1995. – № 10. – С. 52–55.

10. Прокопцова В.П. Музыкальное образование // Очерки истории науки и культуры Беларуси IX – начала XX в. / Редкол.: П.Т.Петриков, М.К.Кошелев, Т.С.Протько и др. – Мінск: Навука і тэхніка, 1996. – С. 280–288.

11. Пракапцова В.П. Нясвіж як адзін з асноўных цэнтраў мастацкай адукацыі Беларусі ў XYIII стагоддзі // Асновы мастацтва. – 1998. – № 2. – С. 34–37.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. Пракапцова В.П. Мастак, педагог, навуковец // Альманах 98/1 Зап. Бел. акад. мастацтваў / Рэдкал.: Р.Б.Смольскі, А.А.Каляда, І.І.Крук і інш. – Мінск, 1999. – С. 148–154.

13. Пракапцова В.П. Мастацкая культура і мастацкая адукацыя (мастацкае жыццё Нясвіжа XYI–XYIII) // Асновы мастацтва. – 2000. – № 3. – С. 3–13.

**Артыкулы ў энцыклапедыях**

14. Масленікава В.П. Бяссмертны А.Л. // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1984. – Т.1. – С. 552–553.

15. Масленікава В.П. Віцебск: Музычнае жыццё // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1984. – Т. 1. – С. 639.

16. Масленікава В.П. Магілёўская дзіцячая музычная школа імя М.А.Рымскага-Корсакава // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 348.

17. Масленікава В.П. Марцінкевіч Каміла // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 449-450.

18. Масленікава В.П. Мінскае вучылішча арганістаў // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 551–552.

19. Масленікава В.П. Мінскае музычнае вучылішча // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 553.

20. Масленікава В.П., Школьнікаў Я.Л. Мінскае музычнае вучылішча імя М.І.Глінкі // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 553–554.

21. Масленікава В.П., Капілаў А.Л. Мінскае таварыства сяброў музыкі // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1986. – Т.3. – С. 555.

22. Масленікава В.П. Мінская вакальная студыя // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 560.

23. Масленікава В.П. Мінская музычная школа // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 562.

24. Масленікава В.П. Мінскі пансіён // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 661.

25. Масленікава В.П., Яканюк В.Л. Музычнае выхаванне // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 691–693.

26. Масленікава В.П. Музычнае жыццё Магілёва // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 341–342.

27. Масленікава В.П. Музычная адукацыя // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 693–694.

28. Масленікава В.П. Музычныя вучылішчы ў БССР // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 698.

29. Масленікава В.П. Музычныя школы ў БССР // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 699–700.

30. Масленікава В.П. Муранская Н.М. // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 704.



31. Масленікава В.П. Народныя кансерваторыі // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1987. – Т. 4. – С. 37–38.

32. Масленікава В.П. Нясвіжская музычная школа // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1987. – Т. 4. – С. 100.

33. Масленікава В.П. Пятроў Г.М. // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1987. – Т. 4. – С. 432.

34. Масленікава В.П. Сярэдняя спецыяльная музычная школа // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1987. – Т. 5. – С. 221.

35. Масленікава В.П. Шклоўская музычная школа // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1987. – Т. 5. – С. 572.

36. Масленікава В.П. Шуміліна І.М. // ЭЛіМ Бел. – Мінск, 1987. – Т. 5. – С. 592.

37. Пракапцова В.П. Марцінкевіч К.В. // Беларусь: Энцыкл. даведнік / Рэдкал.: Б.І.Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭН, 1995. – С. 465.

38. Пракапцова В.П. Масленікаў П.В. // Беларусь: Энцыкл. даведнік / Рэдкал.: Б.І.Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭН, 1995. – С. 466–467.

39. Пракапцова В.П. Мінскае музычнае вучылішча // Беларусь: Энцыкл. даведнік / Рэдкал.: Б.І.Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭН, 1995. – С. 486.

40. Пракапцова В.П. Нясвіжская музычная школа // Беларусь: Энцыкл. даведнік / Рэдкал.: Б.І.Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭН, 1995. – С. 541.

41. Пракапцова В.П. Шклоўская музычная школа // Беларусь: Энцыкл. даведнік / Рэдкал.: Б.І.Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭН, 1995. – С. 767.

**Матэрыялы міжнародных навуковых канферэнцый і кангрэсу**

42. Пракапцова В.П. Мастацкая адукацыя і дзейнасць асветнікаў Беларусі ў другой палове XVII–XVIIIстст. // Кірыла-Мяфодзіеўскія навуковыя чытанні, прысвечаныя Міжнароднаму дню славянскага пісьменства і культуры: Матэрыялы чытанняў, Мінск, 23 мая 1997 г. – Мінск: Бел. ун-т культуры, 1998. – С. 61–69.

43. Пракапцова Вера. Мастацкая адукацыя ў Нясвіжы другой паловы XVII–XVIII стст. // Нясвіж: гісторыя, культура, мастацтва. Nieswiez: Historia. Kultura. Sztuka.: Materialy konferencji naukowych w Nieswiezu (1994, 1997). – Warszawa; Minsk: NOKPOL, 1998. – С. 117–119.

44. Пракапцова В.П. Вытокі мастацкай адукацыі ў Беларусі // IV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры: Матэрыялы чытанняў, Мінск, 24- 26 мая 1998 г.: У 2 ч. / Еўрап. гуман. ун-т, Бел. ун-т культуры, Рэдкал.: Пазнякоў А.У. (адк. рэд.) і інш. – Мінск: Бел. ун-т культуры, 1999. – Ч 2. – С. 6–10.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

45. Пракапцова В.П. Ельскія з Дудзічаў – вядомыя прадстаўнікі мастацкай культуры Беларусі XIX ст. // Дзеля блізкіх і прышласці: Матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. "Універсітэты Ельскіх" (да 165-годдзя з дня нараджэння А.Ельскага), Мінск, 7 кастрычніка 1999 г. / Бел. ун-т культуры; Рэдкал.: Пазнякоў А.У. (адк. рэд.) і інш. – Мінск: Бел. ун-т культуры; рэкламна-выд. фірма "Ковчег", 1999. – С. 129-133.

46. Пракапцова В.П. Мастацкая адукацыя ў Віцебску і Мінску ў 20-я гады XX стагоддзя // Проблемы национальных музыкальных культур на рубеже третьего тысячелетия: Материалы междунар. науч. конф. "Цивилизация и культура: проблема актуальности национального фактора на рубеже третьего тысячелетия (музыкальный аспект)", Минск, 29–30 окт. 1998 г. – Минск: БелИПК, 1999. – С. 151–157.

47. Пракапцова В.П. Мастацкая адукацыя ў Беларусі: вопыт тысячагоддзя // Беларускае асветніцтва: вопыт тысячагоддзя: Матэрыялы II міжнар. кангрэса, Мінск, 17–19 мая 2000 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М.Танка, Нац. навук.-асв. цэнтр імя Ф.Скарыны. – Мінск, 2000. – Кн.2. – С. 33–37.

48. Пракапцова В.П. Вопыт ланкастэрскага навучання ў сістэме мастацкай адукацыі на Беларусі ў першай чвэрці XIX ст. // Помнікі мастацкай культуры Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф. "Музы Нясвіжа", 13 мая 2000 г. – Мінск: Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі, 2000. – С. 83–86.





## РЭЗЮМЕ

**Пракапцова Вера Паўлаўна**

**Мастацкая адукацыя ў Беларусі: сацыякультурны аспект**

**Ключавыя словы:** мастацкая адукацыя, мастацкая школа, мастацкая культура, сацыякультурны працэс, сінкрэтызм, сінтэз мастацтваў, музычнае, тэатральнае, выяўленчае, харэагрфічнае мастацтвы, творчая асоба, сістэма, формы, узроўні адукацыі, структура, функцыі, метады, эпохі Сярэднявечча, Адраджэння, Асветніцтва, Рамантызму, Савецкі і постсавецкі час.

**Аб'ект даследавання** – цэласная сістэма мастацкай адукацыі ў Беларусі, што развівалася на працягу стагоддзяў у межах пэўных сацыякультурных прастораў і сфарміравалася ў стабільную дзяржаўную структуру ў XX ст.

**Мэта дысертацыі** – выяўленне сутнасных, асноватворных заканамернасцей фарміравання мастацкай адукацыі як цэласнай сістэмы ў Беларусі і вызначэнне спецыфічных асаблівасцей яе састаўных, відавых і формастваральных элементаў структуры на розных гістарычных этапах.

**Метадалагічнай асновай даследавання** стаў сістэмны падыход – сістэма прынцыпаў, метадаў, спосабаў навуковага пазнання, якая дае падставы для вызначэння агульнай накіраванасці рэтраспектыўнага, актуальнага і перспектыўнага развіцця мастацкай адукацыі.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Дысертацыя з'яўляецца першым спецыяльным комплексным даследаваннем сістэмы мастацкай адукацыі, шляхі фарміравання якой ахопліваюць у Беларусі тысячагадовы перыяд. **Упершыню** аўтарам прапанавана **канцэпцыя** навуковага вывучэння сістэмы мастацкай адукацыі ў адзінстве працэсаў, што адбываліся ў межах розных відаў мастацтва.

**Атрыманыя ў выніку дысертацыйнага даследавання матэрыялы** выкарыстоўваюцца пры чытанні аўтарскага спецкурса, а таксама ў агульных курсах па гісторыі беларускага музычнага, выяўленчага, тэатральнага мастацтва. Вынікі даследавання выкарыстоўваліся пры распрацоўцы вучэбных планаў і дзяржаўных стандартаў вышэйшай адукацыі ў галіне культуры і мастацтва. Змястоўныя і метадалагічныя асновы дысертацыі могуць атрымаць развіццё ў тэарэтычных і гістарычных працах у галіне мастацкай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЕЗЮМЕ

**Прокопцова Вера Павловна**

**Художественное образование в Беларуси: социокультурный аспект**

**Ключевые слова**: художественное образование, художественная школа, художественная культура, социокультурный процесс, синкретизм, синтез искусств, музыкальное, театральное, изобразительное, хореографическое искусства, творческая личность, система, формы, уровни образования, структура, функции, методы, эпохи Средневековья, Возрождения, Просвещения, Романтизма, Советское и постсоветское время.

**Объект исследования** - целостная система художественного образования в Беларуси, которая развивалась на протяжении столетий в рамках определённого социокультурного пространства и сформировалась в стабильную государственную структуру в XX ст.

**Цель диссертации** – выявление сутностных, основополагающих закономерностей формирования художественного образования как целостной системы в Беларуси и определение специфических особенностей её составных, видовых и формообразующих элементов структуры на разных исторических этапах.

**Методологической основой диссертации** стал системный подход – система принципов, методов, способов научного познания, дающая основы для определения общей направленности ретроспективного, актуального и перспективного развития художественного образования.

**Научная новизна и значимость полученных результатов.** Диссертация является первым специальным комплексным исследованием системы художественного образования, пути формирования которого в Беларуси охватывают тысячелетний период. **Впервые** автором **предложена концепция** научного изучения системы художественного образования в единстве процессов, происходящих в рамках разных видов искусств.

**Полученные в результате диссертационного исследования материалы** используются при чтении авторского спецкурса, а также в общих курсах по истории белорусского музыкального, изобразительного, театрального искусства. Результаты исследования использовались при разработке учебных планов и государственных стандартов высшего образования в области культуры и искусства. Содержательные и методологические основы диссертации могут получить развитие в теоретических и исторических трудах в области художественной





## Summary

**Prokoptsova Vera Pavlovna**

**Artistic Education in Belarus: Sociocultural Aspect**

**Key Words:** artistic education, artistic school, artistic culture, sociocultural process, syncretism, synthesis of arts, musical, theatrical, fine, choreographic arts, creative personality, system, form, levels of education, structure, function, method, Middle Ages, Renaissance, Enlightenment, Romanticism, Soviet and the post-Soviet time.

**Research Object** – the integrated system of the artistic education in Belarus which has been developing during ages in the frames of a definite sociocultural territory and has formed into a stable state structure in the 20-th century.

**Thesis Aim** – the revealing of the fundamental objective laws governing the formation of an artistic education in Belarus and the revealing of the characteristic features of its components, specific and formdeveloping element of a structure at the different historic stages.

**Methodological basis of the thesis** is the system approach. This is the system of principles, methods, ways of a scientific knowledge which gives a basis for a determination of a general direction of a retrospective, actual and perspective development of the artistic education.

**Scientific novelty and significance of the obtained results.** The thesis is the first special complex research of the artistic education system, the ways of its formation in Belarus cover the one thousand period. The concept of a scientific studying of the artistic education system in the unity of the processes going on in the frames of different kinds of arts was proposed by the author for the first time.

**The materials received in the result of the thesis research** are used while delivering the author's special lecture course and as well in the general course in the history of the Belarusian musical, fine, theatrical art. The results of the research were used while working out the educational plans and the state standards of the higher education in the sphere of culture and art. The profound and methodological basis of the thesis may receive the development in theoretical and historical works in the artistic culture sphere.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковае выданне

**Пракапцова Вера Паўлаўна**

**МАСТАЦКАЯ АДУКАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ: САЦЫЯКУЛЬТУРНЫ АСПЕКТ**

**Аўтарэферат**
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
доктара мастацтвазнаўства

Падпісана ў друк 20.II.2000 .Фармат 60x84 1/16
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 2.09. Тыраж 120 экз.
Заказ 246.

Надрукавана на рызографе Беларускага універсітэта культуры
220001, Мінск, вул.Рабкораўская, 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ